# Аднойчы вечарам

## Вершы тэбээмаўскіх паэтаў

Мінск
Выдавец Зміцер Колас
2015

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5
А31

Укладальнік Мікола Бамбіза
Прадмова Яўгена Гучка.

А31 **Аднойчы** вечарам : вершы тэбээмаўскіх паэтаў / Уклад. М. Бамбіза, прадмова Я. Гучок. — Мінск : Зміцер Колас, 2015.— 172 с.
ISBN 978-985-6992-80-6
Кнігу складаюць вершы паэтаў – сталых наведвальнікаў праграмы «Будзьма беларусамі» пры Рэспубліканскім таварыстве беларускай мовы імя Францішка Скарыны.

**УДК 821.161.3-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-6992-80-6**
©Бамбіза М., укладанне. 2015.
©Гучок Я., прадмова, 2015.
©Афармленне. Выдавец Зміцер Колас, 2015.

# Прадмова

У кнігу ўвайшлі паэтычныя радкі некаторых беларускіх паэтаў – гарачых прыхільнікаў беларушчыны. Іх неабыякавасць да лёсу роднай Беларусі, яе гісторыі, культуры, мовы прывяла іх у Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны. Сюды яны прынеслі свае паэтычныя дараванні, свае паэтычныя радкі. Сёння мы маем мажлівасць пазнаёміцца з імі. Амаль ніхто з іх не з'яўляецца прафесійным літаратарам, не мае бонусаў з сваёй творчасці, але іх тэксты, своеасаблівыя і непаўторныя, не пакінуць раўнадушнымі тых, хто да іх звернецца. І яшчэ. У кнізе змешчаны пераважна творы, якія прагучалі на адной з літаратурных вечарын у красавіку 2015 года на сядзібе ТБМ.

*Яўген Гучок*



## Багданкевіч Святлана

Нарадзілася ў 1947 годзе ў вёсцы Рубяжэвічы Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і настаўнікаў. Скончыла Стаўбцоўскую СШ №1 у 1965 годзе – з залатым медалём. У тым самым годзе паступіла ў Беларускі дзяржаўны педагагічны інстытут (цяпер – БДПУ імя Максіма Танка) на музычна-літаратурны факультэт. Пасля заканчэння інстытута працавала ў Мінскім педагагічным вучылішчы (пазней – Мінскім педагагічным каледжы №1

імя Максіма Танка) выкладчыкам музычных дысцыплін (фартэпіяна і беларускай музычнай літаратуры ў групах з музычнай спецыялізацыяй). Вершы пішу з 1970-х гадоў, але доўгі час нідзе не друкавалася, першыя спробы былі на рускай мове. З канца 1980-х пачалі з'яўляцца мае паэтычныя публікацыі і артыкулы ў перыядычных выданнях, у альманахах «Дзень паэзіі» і ў калектыўных зборніках клуба «Спадчына» – «Скрыжалі “Спадчыны”».

У 2012 годзе выдала зборнік вершаў і перакладаў з польскай паэзіі «Напрадвесні» (2 выданні – накладам 200 і 150 асобнікаў) у выдавецтве «Ковчег». У лютым 2013 года прынятая ў Саюз беларускіх пісьменнікаў.

## Экспромт да Дня Волі 2015

Віншуюць са святам,
а ці ж гэта – Свята?
Бо тое ж не зроблена,
што распачата…
Народная справа
на шмат пакаленняў!
Шчэ прыйдзе – сталенне,
ўставанне з каленяў!
Яна аднадумцаў збярэ, аднаверцаў –
Для працы з’яднанае розумаў, сэрцаў!
А будзе яднанне, то плён дасць змаганне,
І гмах нашай Мары – наяве паўстане!

*25.03.2015*

# Код несмяротнасці

Мне сніўся Ўсявышняга суд.
На ім увесь род чалавечы.
Стары лад жыцця ён аспрэчыў,
Што вёў яго шляхам пакут.

Найвысшы, найстрожшы іспыт,
Што вызначыць лёс назаўсёды,
Трымалі прад Богам народы…
А вырак – жыццё ці нябыт.

З шматмоўнай людской грамадой
І мы тут былі, беларусы…
А там ужо – чэхі, французы
Прайшлі свой іспыт чарадой.

На сонечны, радасны шлях
Жыцця яны смела ступалі,
І ўсіх, хто чакаў там, віталі –
З любоўю, святлом у вачах.

Казалі: «Не страшны зусім
Быў суд нам – ён нас не зняволіў!
Хто сам захаваць сябе здолеў,
Жыццё Бог дае тым усім».

Прайшло шмат шчаслівых, але…
У прорву хтось падаў, як прусы…
І вось прад Суддзём – беларусы, –
Стаяць у няўмольным святле.

Гартае Суддзя пухлы том:
«Народ – не жывы і не мёртвы…
Загінулы кожны чацвёрты…
Нязжыты імперскі сіндром…

Найгоршы яму выпаў лёс –
Быў сціснуты між веліканаў!
Збялелы, збалелы ад ранаў,
Цярпліва ён крыж свой пранёс…»

Задумаўся грозны Суддзя:
Што вызначыць ім канчаткова?
Пытае: «А дзе ваша мова?
У мове – зарука жыцця!

Яе вы – з надзелам зямлі –
У спадчынны дар атрымалі,
Каб з мовай – сабою вы сталі,
Свой вобраз, свой дух здабылі!!!

Ніхто не засудзіць на скон
Таго, хто збярог сваё слова!
Бяссмерця ў ім код адмысловы!..»
І тут – перарваўся мой сон…

# Белы сцяг

Народ без мовы – сэрца без любві,
Адзін натоўп, а не народ, не нацыя…
Панік наш сцяг, як цела без крыві,
Ператварыўся ў сцяг капітуляцыі.

# Непераможнасць

Наш дзіўны час праявай кожнаю
Змушае прызнаваць няўхільна,
Што дурата – непераможная!
І розум перад ёй – бяссільны.

# Каб не ўмёрлі

*Уладзіміру Содалю*

Беларусі хапала заўжды разбуральнікаў,
Руйнавальнікаў, вынішчальнікаў
Яе гонару, мовы, асноў.

Ох, каб болей жа ёй – ратавальнікаў,
Шанавальнікаў, апявальнікаў,
Адраджэнцаў, руплівцаў, стваральнікаў,
Захавальнікаў каранёў
Ды збіральнікаў камянёў!

Хто вы сёння, яе героі?
Непрыкметныя рыцары-воі,
Што па кроплях яе зберaглі.
Хай абраных няшмат, іх вобмаль,
Ды сам дух яны, соль зямлі!
З іх кагорты – Уладзімір Содаль.

Ад бяспамяцтва нас ратуе,
Каб у невараць не сплылі,
Каб не ўмёрлі мы, ён шчыруе
На святой беларускай раллі.

*15.09.2012*

# Беларусы ў горадзе!

У краме «Стужка»,
што пераназвана ў «Ленту»,
купляла днямі стужкі я і тасьмы.
Прыцэньвалася, доўга выбірала…
Тым часам падышла ў аддзел дзяўчына,
звярнулася яна да прадавачкі
без лішніх рускіх слоў, па-беларуску:
«Вунь той мне, калі ласка, белай стужкі –
за дзве пяцьсот, і той, за тры, чырвонай –
адрэжце, калі ласка, па тры метры!»
Усё зрабіла моўчкі прадавачка –
кошт выбіла і стужкі спакавала.
Пакупку падала яна дзяўчыне
і рэшту. Адказала тая: «Дзякуй!», –
ды штосьці на вітрыне разглядала…
Мая чарга, і я па-беларуску
мне паказаць прашу тасьму – «вунь тую».
(Я не была занадта лаканічнай –
усё глядзела ды перабірала
і размаўляла з прадавачкаю «на мове»).
Дзяўчына мне ўсміхнулася вачыма,
па-свойску, непрыкметна… Прадавачка ж
не выказала радасці, здзіўлення,
і нават не сказала: «Как красіва!»,
і слоў беларускіх не ўстаўляла,
не ўспомніла, што «тожа беларуска»…
На нас глядзела хмура, непрыязна,
адчужана… І думала, напэўна:
«Няйначай, горад зноўку захапілі беларусы!»

# Імперац

*С. Д.*

Ці чулі? –
Жыве ў нашай вёсцы *імперац*,
Вырошчвае бульбу, фасолю і перац,

Цыбулю, капусту, салату, гуркі…
Ды што за імперац? І скуль ён такі?

Капае зямлю ён. Праполвае грады,
Збірае ўраджаі… А ўсё-ткі не рады…
Хімера душу атруціла суздром,
Завёўся ў пячонцы імперскі сіндром.

Наўкола – прасторы! Лясныя абшары!
Але не пра тое ягоныя мары!
Ён трызніць, каб час як назад павярнуць,
Цара ды імперыю людзям вярнуць.

«Імперац я, – кажа. – І тым ганаруся!
Мне моташна ў сённяшняй жыць Беларусі!
Заместа падданых – тут процьма паноў!
Імперыю трэба ствараць нам наноў!»

Гурман памідорны, капусты аматар!..
Навошта ж патрэбен яму імператар?
Маёнтка свайго  і двара гаспадар,
А як бы хацеў, каб над намі быў цар!

Заснуць не дае тая мара-хімера…
А дзе ж, брат, твая праваслаўная вера?
Твой Цар – на нябёсах, як верыш ты ў Бога!
«Не, дайце зямнога!..»
Цароў – не замнога?

# Дзень з вершамі Ірыны Багдановіч*

Асеннім днём збіралі яблыкі мы ў садзе –
у вёсачцы сваёй, на дачы;
ды, прагнучы пры тым літаратуры,
прымач павесілі на грушцы, на галіне,
і слухалі тым часам перадачу
на радыё «Культура» –
гучалі вершы там спадарыні Ірыны
і польскія – у ейным перакладзе.

Патроху з яблынь яблыкі знялі ўсе
ды пассыпалі ў кучкі, горкі. скрынкі,
вёдры… – безліч порцый!
І чуем: *«светамір перакуліўся,*
*згубіўшы правільнасць памераў і*
*прапорцый…»*

Каб ціснуць сок, заведзена машына, –
раве – і чхае, кашляе… Сок пачынае ліцца.
А голас – з грушкі, нібы спеў птушыны:
*«жыватворныя сокі струменяць –*
*зямлі і нябёсаў крыніцы;*
*набрыняць імі ўдосталь,*
*напіцца,*
*душой наталіцца…»*
*«…разумееш свой шлях,*
*адзінокі і марны…адзіны…»*

---

* Ірына Багдановіч – вядомая паэтэса, перакладчыца, літаратуразнаўца. У вершы выкарыстаны фрагменты з яе кнігі паэзіі і перакладаў «Душа лістападу» (Мінск, «Кнігазбор», 2012).

Працуем, не шкадуем сіл. Паволі
Стамляемся. Работы ж да халеры! Як заўжды.
Ды не бяды –
хай цяжка несці, будзе смачна есці!
Паэткі каментар прыдаўся і сюды:
*«А смачна ж есці*
*ежу са слязьмі*
*жаночай долі,*
*звітай у цярпенне…»*
І праўда! – думаю, –
Бо мне ж яшчэ варыць варэнне!
Як адпачнеш, калі адна ты – на ўсе ролі?..

А ўвечары – гарбатка або кава –
Хто лепей ад чаго засне.
Чытаю Біблію: «Туліся… Бог прытуліць…»
Больш нічога… Сплываю ў сон…
І толькі гэты вершык – дня апошняя праява –
ўсё трызніцца праз сон… Ці мо ўжо ў сне? –
*«У душы так ласкава-ласкава,*
*як быццам прытулілася да Бога*
*або Бог прытуліўся да мяне».*

## Чуйную...

### трыялет

*«…Журботная душа мая аж да смерці:*
*пабудзьце тут і не спіце са мною».*
Св. Евангелле паводле Мацвея, 26:38

Не сплю, чуйную цягам доўгай ночы
З настольнай лямпай над «Святым Пісаннем».
Сон, як анёл, зляціць мо перад раннем…
Не сплю, чуйную цягам доўгай ночы.

Перад Крыжом, Сваім наканаваннем,
Не спіць Хрыстос… І я не мружу вочы –
Не сплю, чуйную цягам доўгай ночы
З настольнай лямпай над «Святым Пісаннем».

# Без мяне

*«Мяне няма…»*
Валянцін Акудовіч

Ранкам сонечны промень абудзіць мяне
да жыцця.
Сны наўскач разбягуцца, і стоўпяцца думкі
наўкола…
Закукуе у лесе зязюля – з-за хвоі, травы
і лісця,
І вясёлкамі блікі зайграюць, закружацца цені
вясёла.

У лажбінах абапал дарог ледзь бялее туман…
Я ўсё бачу і чую. Рыфмую ўсё тут – як жывая!
Я нібыта існую. Дый веру: я ёсць! Але гэта
падман.
Без мяне тут само ўсё сваволіць! І танчыць усё,
і спявае…

***

Ноч… Ты спіш.
Ды не спіць маладзік на пярыне
Серабрыстых пярыстых аблокаў…
І салоўка не спіць на ляшчыне –
вакалізы свае выпявае…
Лёгкі ветрык не спіць – павявае…

І не спіць у каморы мыш –
шамаціць і бразгоча начыннем…
Мышалоўку шукае у змроку,
ці ката, што чувае,
прыжмурыўшы вока…

Ноч – жывая…

# Ёсць пытанне

Як зразумець – чаму, навошта Бог
стварыў людзей?
І вось жа – клопат мае!
Тлумачыў Ён: «Даўно было –
зрабіў, як мог!»
Майстэрства падвяло?
Яно-то так!
Але за гэты брак,
што здзейсніў Дабрадзей,
Ніхто з Яго адказнасць
не здымае!

## Здарэнне на ТБ

Знаёмец на ТБ!
Няўжо так асмялеў?
Але ж загаварыў!
Рэжым хваліў, бубніў
аб нашых моваў роўнасці.
«І з дэмакратыяй, – казаў, –
у нас – цудоўна ўсё!»
(Вядоўцу, бачу,
ўжо бярэ трасучка).
Прамоўца ж на вачах
круглеў, шарэў і мізарнеў…
Гляжу – а ён застыў! –
бы на марозе кучка.
Не-не, не думайце,
ніякай непрыстойнасці!
Яна, пардон, хоць і смярдзючка,
ды гэта ж проста –
кучка
памяркоўнасці!



# Мікола Бакас
## (сапр. Мікола Бамбіза)

Нарадзіўся ў 1952 годзе ў в. Ляскавічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласьці. Бацькі – Бамбіза Рыгор Аляксандравіч і Бамбіза Ганна Кандратаўна – сялянскага паходжаньня, па прафесіі – бухгалтары. У 1978 г. скончыў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі і таксама стаў бухгалтарам па адукацыі. Працаваў доўгі час на рэвізорскіх пасадах, галоўным бухгалтарам у камерцыйных

арганізацыях, аўдытарам-прадпрымальнікам. Стараста менскае аўтакефальнае праваслаўнае суполкі Афрасіньні Полацкае, якая беспасьпяхова спрабуе атрымаць дзяржаўную рэгістрацыю і аднавіць дзейнасьць Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы, зьнішчанай камуністычнай уладаю ў 1937 годзе. Спрабаваў займацца паэзіяй са школьных гадоў, але сур’ёзна і на беларускай мове – з 2000 года. Сябар ГА «Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны». Асобныя вершы друкаваліся ў газетах «Наша слова», «Беларус», у часопісе «Верасень». Жыве ў Менску. Ліцьвін.

# Малітва беларуская

О Божа вялікі, мы – Твае дзеці,
Мы – беларусы на гэтай планеце.
Каб наша дзяржава расла і квітнела,
Каб нашыя сэрцы дабром багацелі,
На літасьць Тваю спадзяёмся мы, Божа.
Хто верыць у Бога – той зло пераможа.

Мы самі у цемры яго нажывалі,
Калі самавольства сваё шанавалі.
Нам сорамна, Божа, нам крыўдна прызнацца
У нашай няпраўдзе, у нашым жабрацтве.

Спаўна мы спазналі сірочае долі.
Наш Бацька і Творца, мы просім: даволі,
Твайго прабачэньня мы просім: памілуй,
З надзеяй і верай мы просім: прымі нас,
Прымі пад ахову Тваю беларусаў, –
Да Ласкі і Праўды – ад зла і спакусаў,

Прымі, як дзяцей, пад Бацькоўскую руку.
Заўжды мы удзячны Табе за навуку
Як трэба любіць, дараваць і змагацца
За права пачэснае Божымі звацца.

Па волі Тваёй ды паўстане дзяржава.
Навекі вякоў Твая сіла і слава!

## Да Божае ласкі – пад сьцягам Хрыста

Жыве Беларусь, нібы праўда сьвятая!
Ты з крыжам была і была на крыжы.
Ад Бога табе гэты крыж ратавальны –
Каб праўды трымацца і з вераю жыць:
Як белая ружа – быць гожай і чыстай,
Як Белая вежа – стаяць непахісна,
Бярозкаю белай цягнуцца да неба –
Да Божае ласкі, да Божага хлеба.

З чаго гэты хлеб? Ён – з цярпеньня й любові,
А сіла яго – ад спрадвечнага Слова,
Што кліча людзей на сумленную споведзь,
Каб вартымі сталі ахвяры Хрыстовай…
Ахвяры Хрыстовай і матчынай мовы.

Ад Слова стварылася наша жыцьцё,
А наша Айчына – ад роднага слова.
Няхай жа гучыць яно гімнам вясновым
Магутнаму Богу і маці з айцом!

Пад сьцягам Хрыста – беларуская праўда,
Яна – наша вера, яна – наша сіла.
Дык пераможам – і будзе улада
Уладай Пагоні, крыжа Афрасіньні –
На радасьць і шчасьце любімай Айчыны!

## Вясна будзе

Хай сьнежань засьнежыць,
хай студзень застудзіць.
Вясьне тыя межы
хаду не змарудзяць.

Нядоўга віхурам з Расеі злавацца,
Нядоўга дыктату марозу трымацца.
Вясну не стрымаць іх варожасьцю лютай.
Сканае зіма. Дачакаемся. Хутка.

І будзе канец маразам-«адмарозкам».
Здаўна іх чакаюць халодныя ложкі.
Яны не пазьбегнуць нябеснае кары.
Той Суд – незалежны. Ён – хуткі і правы.

Вясна пераможа пад сьцягам Хрыстовым.
Жыцьцё загамоніць шчасьліваю мовай.
І чуецца ўжо, як на гук перамогі
«Жыве Беларусь!» – адгукаецца: «З Богам!»

# Пан Хрыстос уваскрос!

Пан Хрыстос уваскрос, сьмерцю
сьмерць патаптаў, –
Лепшы наш Правадыр і Настаўнік!
Ён прыйшоў да людзей і ахвяраю стаў –
Шчодры выкуп за іх ратаваньне.

Бог прыйшоў, і яны асудзілі Яго –
Сьвятары, што служылі уладам.
Асудзілі Любоў, асудзілі Сьвятло,
Асудзілі Дабро і Спагаду.

Асудзілі ў сэрцах, забруджаных злом.
Аддалі на пагубу і зьдзекі
Той уладзе хлусьлівых і штучных багоў,
Што рабіла рабоў з чалавекаў.

Не забойцу, а Збаўцу на сьмерць аддалі,
Бо, па сутнасьці, самі забойцы.
Не патрэбен ім той, чые словы былі:
«Ідзеце за мной і не бойцесь!»

Забівалі каменьнямі сэрцаў сваіх
За дынарый свой гонар прадаўшыя д’яблу.
Род няверны, заўсёды ён ганіў сьвятых,
Бо не праўду любіў, а паганскую славу.

Тая слава сьмярдзіць зь іх нячыстых нутроб.
Як што пуза – алтар, дык душа – у загане.
Пад законам ліхім моўчкі стогне народ,
Ды тлусьцеюць затое злачынцы ў законе.

Не, не ў Божым законе – у бязбожным і злым:
Без суда, міласэрдзя і шчырае веры.
Цемру душ іх вартуе брудны дух кабалы,
А для духа ратунку зачынены дзьверы.

Запанелая плоць не прымае Закон,
Той, сапраўдны Закон, што ратуе ад сьмерці.
Запанелы слуга б’е фальшывы паклон,
Тоіць здраду яго атлусьцелае сэрца.

Гора вам, ганарліўцы, прадажная плоць.
Сьвятары без сьвятла – недастойныя сьвята.
Пан Хрыстос уваскрос! Наш – адзіны –
Гасподзь.
Ён – адзіны Судьдзя, Пан Хрыстос Пантакратар.

Ecce Homo! – Асоба, Змагар за любоў.
Як вучыў, так і жыў, – і пайшоў на Гальготу.
Найвышэйшы прынізіў Сябе да рабоў,
Каб з ніжэйшых абраць змагароў і лагодных.

Пан Хрыстос перамог – бо не раб, а Герой!
Не даецца любоў нетрываламу духам.
Мужных рыцараў збройных адважны Кароль
Сьцяг свабоды нясе паняволеным душам.

# Гаворка пра Паўночную Карэю*

Калі хто ўбогі, ці хварэе,
той годны жалю без прымус,
а мне прыемна, што з Карэяй
чарговы здарыўся канфуз.
Няўдачам іхным я не рады –
не зычу я карэйцам зла,
а хочацца, каб быў парадак,
і каб статыстыка была.

Магчыма, дзеля этыкету
павінен я паспачуваць:
у вас там ляснула ракета,
ох, горка мне, *ядрёна мать!*
Я, праўда, маю спачуваньне.
Шкада мне цэх няшчасны той,
які, напэўна, расстраляны
з усёй радзінаю сваёй.

Ды ёсьць адзін закон прыроды:
ўсё будзе падаць кожны раз
у краі, дзе няма свабоды,
і дзе ва ўладзе підарас.
Гніе ўсё тут і ўсё хірэе,
і людзям цяжка выжываць
(на ўвазе маецца Карэя,
не трэба гэта забываць).

---

* Вольны пераклад, с захаваньнем лексічнай асаблівасьці верша расейскага паэта Леаніда Каганава «Разговор о Северной Корее», прысьвечанага няўдаламу запуску ракеты 13 красавіка 2012 г. у гонар 100 гадоў ад дня нараджэньня Кім Ір Сена, але ўжо вядома і пра запуск паўночна-карэйскага спадарожніка ў сьнежні 2012 г., і пра падземныя ядзерныя выпрабаваньні ўвесну 2013 г., і пра пагрозу нападу на Паўднёвую Карэю.

Якія могуць быць ракеты,
калі паўсюль на чарцяжох
сам кульман выдае партрэты
таго, хто больш ужо, чым Бог?!
Дзе нормай стала бегаць строем
перад дзяржаўным мудаком,
хаўрусьнічаць з любым адстоем,
і ненавідзець Вашынгтон.

Няма дзе больш падстаўнай здрады
і больш бруднейшае віны,
чым пажаданьне, каб улады
харызьму тлустую зьмяніць.
Дзе прынята пісаць даносы,
лізаць падэшвы панскіх бот,
бяспраўным ганарыцца лёсам,
а «заўтрамі» карміць жывот.
Дзе з палымяным мазахізмам
чакаюць дупы бізуноў,
каб лепшым дупам камунізму
свой гонар несьці зноў і зноў.

Мазгі ж, якім пашанцавала,
даўно звалілі за кардон,
астатнія ахвярай сталі
абкімірсераных глуздоў.

Дзе пад прымусам, з-пад дубіны
будуецца чучхерны рай.
Дзе не да храму каляіна,
а да канцлагерных параш.
Кім-дзед, Кім-бацька – ў маўзалеі,
цяпер на троне – ўнучак Кім,
з-за іх Паўночная Карэя
адстала ў разьвіцьці сваім.

Магчыма, дупа з пісталетам
натхніць глуздовы апарат:
Карэя выстраліць ракетай -
ды ў першы і апошні раз.
У дзядзі Сэма нораў строгі,
шантаж не сьцерпіць ён такі:
ён выдзярэ із дупы ногі,
і стане Кім ужо нікім.

А што ж Паўночная Карэя?
Народ твой ці сягне да зор?
Ці ў стане атэіст паВерыць?
А раб – ці здольны на адпор?
Хутчэй на нашую планету
аднойчы Месяц упадзе,
чым прыйдзе ў край нявольны гэты
сьвяточны Вызваленьня дзень.

Рэпрэсій млын працуе спраўна,
а з ім генэтыка й прымус.
Разумны? – хутка станеш даўнам.
Сумленны? – сядзеш у турму.
Нястачамі павяжаш шчырых,
дасьведчаных – праз глум і зьдзек.
Узвысіш злодзеяў, пранылаў.
Прынізіш годных чалавек.

Сялекцыю вось так наладзіш
і, прыкладна, праз сорак год
народзіцца, нібыта з гразі,
адметна якасны народ:
бяспамятны, рахманы, кволы,
прывучаны да алькаголю,
зусім не здольны на пратэст,
і з той прычыны – на прагрэс.

І людзі з часам падурнеюць,
і стане панаваць бардак.
Чаго ж чакала ты, Карэя?
Сусьветнага вяршэнства, так?
Што са сваёй ракетай с..най
ты ўсё-такі ўставіш тым,
хто не вярзе з тэлеэкранаў
пра слаўны посьпех і уздым?

Сядзіць Карэя з дупай голай.
Прыродзе супраць – не папрэш.
Таму не надта ўжо вясёлы,
нарэшце, атрымаўся верш.
Адзін радок тут душу грэе,
бо ёсьць надзея ў тым радку:
пакуль усё тут пра Карэю.
Ды ключавое тут – пакуль.

# Не верце рабам

Не верце рабам і не будзьце рабамі –
Зьбірайцеся, людзі, пад сьцягам Ісуса!
Да волі дабра паказаў Ён напрамак
Ад рабства ліхога хлусьлівых спакусаў.

Не спакушайцеся: людзі – не богі;
Ніхто не набудзе ўласнага раю;
І той не набудзе ўласнай свабоды,
Хто сам сябе ўласным кумірам стварае.

Свабода даецца на добрыя справы,
Як Божая ласка, як лесьвіца ў неба.
Свабода – закон хрысьціянскага права.
А гонар без права, як ёлуп, – ганебны.

Па ім пазнаюцца паганскія душы –
Няўдзячныя, здрадныя, хцівыя, злыя.
Не чуюць сумленьня паганскія вушы,
І вочы – да Божае праўды сьляпыя.

Пакорліва гнуцца іх рабскія сьпіны –
Паганская пыха не ведае жалю.
– Вам Божыя мудрасьць і воля праціўны?
Таму і рабамі ў ёлупа сталі.

Па бруднасьці вашай кумір ваш – нячысты.
Агідныя твары – агідныя справы:
Ад вас застаюцца хлусьня і злачынствы,
А вашым нашчадкам – смуродная слава.

Яны – не ад Бога, імя ім – брыдота.
Ім трэба ўлада, каб шкодзіць і красьці.
Сярод паразітаў няма патрыётаў:
Для іх *über alles* – свае прыхамаці.

Вялікі падман з чалавечым абліччам –
Ілжэчалавек, а як быццам, сапраўдны:
У грошах фальшывых багацьце не лічаць,
У душах фальшывых – падлічваюць здрады.

Хто спыніць нахабства злаякасных клетак?
Ілжэчалавекі – такія ж гадзюкі:
Яныператвораць краіну у гета,
Калі не стрымаць іх паганыя рукі.

Вы чуеце, людзі, набат вашых сэрцаў?:
«Свабоды і праўды! Свабоды і праўды!»
Пад сьцяг Пераможцы і Збаўцы ад сьмерці
Ідзем і ўратуем Радзіму – ад гадаў,
Ад гора-няволі, паганскай улады.

…Тады Беларусь зноў Літвой назавецца:
Як Божы народ – сярод Божых і вольных –
Тым першым імём, што ад Бога даецца.
А іншае вольным насіць – недастойна.

# Мы – ліцьвіны

Без перамог не будзе шчасьця,
А без змаганьня – перамог.
Айчына кліча нас змагацца,
Каб скінуць рускае ярмо.

Багна не любіць зварушэньняў,
А мы жадаем перамен
І верым – нашыя памкненьні
Чакае хуткі хэпі-энд.

Так, будуць страты і ахвяры,
Ды стане вольным родны край,
Зноў дух літоўскі заваярыць
І пан ліцьвін загаспадарыць.
…А зараз дзейнічаць пара!

# Маналог айца Леаніда (Акаловіча)

Мой род – старадаўні, шляхетны, ліцьвінскі.
Вось тут карані яго – ў роднай зямлі,
Парослай імхом, пустазельлем чужынскім
Сярод церпялівых, тутэйшых расьлін.

Дык хопіць цярпець! Мы – не пасынкі ў Бога.
Мы – Божы народ пад назовам Літва.
Літва – гэта лёс, гэта наша дарога
Да лепшае долі, да хараства.

Хто зьбіў нас з цяжкога, вялікага шляху?
Хто беларусаў зь ліцьвінаў зрабіў?
Вялікі ім «дзякуй» – расейцам і ляхам,
Што навучылі свабоду любіць.

Мы зла не трымаем, урок – не забудзем.
Народ скатаваны, ды гонар – жывы.
Мы верым у Божы трыюмф правасудзьдзя!
Мы верым у Божую славу Літвы!

Я ведаю: зь вераю мы пераможам.
Даверма Ісусу прыгнечаны дух,
І станем з Хрыстом супраць хеўры варожай,
І разам прагонім ліхую арду.

Дык скіньце ж, нарэшце, назоў нешчасьлівы,
І скончыцца век беларускіх нягод.
Пад грукат пагоні літоўскай імклівы
Адновіцца век твой, ліцьвінскі народ.

Мы вернем сваё, адбудуем дзяржаву,
Каб стала Вялікаю наша Літва.
І прыйдуць з паклонам Масква і Варшава
Прасіць прабачэньня за колішні гвалт.

Ліцьвінам належыць літоўская слава
І спадчына продкаў ліцьвінскай крыві.
Няма немагчымага дужым і правым,
Дык будзь жа ты годным нашчадкам, ліцьвін!

***

Ты вольны, калі над усім гаспадар –
І слову, і ў хаце, і ў роднай Айчыне.
Чужы, абыякавы – раб ці жандар,
Над воляй тваёй запануе чужынец.

## З Пагоняй і вераю – да перамог

**С**ьвятая Пагоня імчыць скрозь стагодзьдзі –
**Л**іцьвінская прага да волі жыве!
**А**дноўлены край будзе жыць у свабодзе.
**В**ялікай Літвою яго назавем.
**А**йчына, ты зведала гора нямала.
**Т**ы несла свой крыж і была на крыжы.
**В**арожую сілу сваёю ламала.
**А**д здрады і гвалту ахвяраю стала
**Р**абункаў усходніх, заходняй ілжы.
**Ц**ярпеньне і вера твой дзень улагодзяць,
**У**зброены вершнік твой гонар адродзіць

**На славу Тварцу**
**і Вялікай Літве!**



# Вера Буланда

Нарадзілася ў горадзе Маскве 26 сакавіка 1955 г. У 1972 г. скончыла Мсціжскую СШ, што на Барысаўшчыне, у 1977 г. – педінстытут імя А. М. Горкага, народны тэатр «Жывое слова», у 1981 г. – Маскоўскі завочны ўніверсітэт мастацтваў, тэатральны факультэт, акцёрскае аддзяленне. Настаўнічала ў Чашніцкім і Лепельскім раёнах Віцебскай вобласці, у Барысаўскім раёне Мінскай вобласці, у Мінску. Пра настаўніцу В. А. Буланда беларускім тэлебачаннем створаны дакументальны фільм

«Сэрца аддаць дзецям». Яна была дэлегатам I з'езда настаўнікаў Рэспублікі Беларусь. Для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры выдала дапаможнік «Ад свята да свята».

Вершы піша са школы. Друкавалася ў газетах «Рэспубліка», «Настаўніцкая газета», «ЛіМ», «Культура», часопісах «Беларусь», «Алеся», «Вожык» і інш. Выдадзеныя зборнікі вершаў: «Запалі імгненне», «Мне не жыць без цябе», «Цыганскія кастры», «Шчырая споведзь мая», «Сараматніца», вершы перакладзены на рускую (самастойна), французскую (Нінай Дзябольскай) і шведскую (Антанінай Зайцавай) мовы. У 2010 г. выдадзена кніга прозы «Най-Люба-я». Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў.

# Крый Божа

«Крый Божа», – бабуля пераржагнала
Мяне і радню, ідучы ў нікуды,
«Крый Божа вас, дзеткі», – яна прастагнала, –
Ад войнаў, і гора, і ўсякай бяды».

Нібы запавет, пранясу я два словы,
Каб дзеці і ўнукі запомнілі іх,
Крый Божа не ведаць бабулінай мовы,
Крый Божа зрачыся вытокаў сваіх.

Крый Бог вас забыцца на бацьку і маці
І не вяртацца да тых берагоў,
Дзе першыя крокі вашы па хаце,
Буслы дзе рабілі па сотні кругоў.

Хай будзе заўжды на зямлі гэтай добра
І дзецям, і ўнукам, і верным буслам.
Крый Божа людзей ад турмы і ад торбы…
Каб спраўдзіцца толькі бабуліным снам.

***

Хто там плявузгаў,
Што край мой загіне.
Няма беларусаў, маўляў, мужыкі.
У беластвольнай, азёрнай і сіняй
Лапцюжныя, брудныя палешукі.

Гляджуся ў азёры любімай Айчыны,
Чытаю паданні сівой даўніны,
Заглядваю ў летапіс пушчаў, даліны,
Знаходжу ў бяросце радкі Скарыны.

Радкі за радочкамі ў сэрца ўбіраю,
Смакую, люблю, разумею яго:
«Не можам мы жыці без роднага краю,
Як птушкі гнязда не кідаюць свайго».

***

Чым болей мы жывем, –
Глыбеюць нашы раны,
Бывае, лёс клянем
Свядома і старанна.

І Бог такі глухі
Да самае магілы…
Адпусцяцца грахі?
Ого – якая міласць!

А нам даўно на боль
Так хочацца забыцца,
І на разлад з сабой.
На іншыя драбніцы.

Адкінуць крык і гвалт,
Махлярства і разбоі,
І каб, як родны брат,
Быў кожны зноў з табою.

Чым болей мы жывем, –
То раны больш глыбеюць,
Так з болем і памрэм:
Іначай жыць не ўмеем.

# Асцярожна
## Элегічны двуверш

Спевы хвалебныя мне не чытайце, панове:
Ведаю, к шчасцю, цану і сабе, і паэзіі я.

І не лавіце з сарказмам ліслівым на слове,
Бо даражэй вам абыдзецца шчырая споведзь мая.

***

Ад хмаркі птушка адплыла за небасхіл
І кропачкай ледзь бачнаю прапала –
Ні голасу, ні трапятлівых крыл,
І толькі сэрцу раптам скрушна стала.

Вось так і мы нячуйна адплывем
У свет халодны і адчайна дзікі,
Чаму ж не ў радасць дзень, якім жывем,
Пакуль не знік ад нас увачавідкі?

***

Раскрыжаваная і вінаватая,
З думай-гадзюкай у сэрцы ўсяеднаю:
Як бессаромна сыцеюць багатыя,
І беспрасветна як мэнчацца бедныя.

Хоць разарвіся на тонкія рысачкі,
Вочы на камнях раструшчы паскудныя,
Ці размяціся ў пажарышчы прысакам,
На астравы пасяліся бязлюдныя.

Толькі б не ведаць, не бачыць, не мучыцца
Болем свядомай бездапаможнасці:
Паспачуваць тым, хто з голаду курчыцца,
Ці шкадаваць тых, хто гіне ў заможнасці?

***

Ах, словы, словы, самыя патрэбныя,
Чамусьці пры сустрэчы не прыгадваюцца,
Не мудрыя, не самыя хвалебныя,
Звычайныя, каб проста шчыра радавацца.

Сябрам і выпадку – бывае так – шчасліваму,
Каб аж да скону дзён тваіх прадоўжыўся.
Ах, словы, словы, з думкамі вірлівымі,
Я рада з вамі шмат гадоў трывожыцца.

***

Да ніткі абабраная душэўнасць,
І справядлівасць збітая з дарогі,
Замерзла шчырасць і ўчарнела вернасць,
У страху сціпласць, ды не без трывогі
Каханне, любасць, шчасце і надзея…
Мастацтва свет ніколі не ўратуе,
Пакуль злачынству будзе прывілея,
Пакуль духоўнасць у душы пустуе.

## На чужым свяце

На чужым, так бывае, свяце
Ты нібыта сядзіш на памінках
Маладосці сваёй і шчасця –
Не застацца, не – раптам – знікнуць.

Таньчыць так, каб на ўсё забыцца,
І спяваць, каб зусім не змоўкнуць.
У чужых гасцях – не гасціцца,
І на свяце чужым – як здохнуць.

Хай мне будзе стакроць самотна,
На мяне, як дзівачку, гляньце,
Калі раптам мая адзінота
Не заседзіцца ў вас на свяце.

# Буланды

Месца пад небам сабе не аспрэчваю,
І не прымерваюся да ўладаў,
Мне проста даволі старонкі з рэчкаю,
Што калыхала на хвалях Буландаў.

Я не для славы вершыкі складваю,
І не за дзякуй, не для карысці,
Я у даўгу прад усімі Буландамі,
Жыў хто раней і са мною калісьці.

Я у даўгу перад лугам, буслянкаю,
Вымерлай разам з бацькоўскім садам,
Дзе вечарамі, напэўна, гаўкае
Здзічэлы сабака Сашы Буланды.

Дзе неўпрыкметкі да хат падпаўзаючы,
Дзядоўнік з палынам пануюць уладна,
Струхлелае з часам наша аржанішча
Чакае сейбітаў з роду Буландаў.

Месца пад небам там хопіць кожнаму,
І ўсім на зямлі маёй будуць рады,
Хай землякі толькі стануць заможнымі,
А разам з імі і ўсе Буланды.

# Я вярнуся

*Я знайду дарогу назад,*
*пакуль вы будзеце любіць мяне.*
В. Моцарт.

Як час на месцы не стаіць,
Як круціцца зямля у скрусе,
Пакуль вы будзеце любіць,
Я ад сябе да вас вярнуся.

Каб толькі сонцу не астыць –
Я кожнай тканкаю малюся.
Пакуль вы будзеце любіць,
І я пад сонцам застануся.

Пакуль вы будзеце любіць,
Ад шчасця я не адракуся,
Бо як без вас на свеце жыць,
Вы пачакайце – я вярнуся.

## Перыпетыя

А раняць часцей нас тыя,
Каго мы любім найбольш.
Такая перыпетыя –
Ад родных мацнейшы боль.

## Упэўненасць

А колькі гаворак, і пыхі, і здзекаў
З сваёй беларускае матчынай мовы!..
Упэўнена: быць мне святым чалавекам,
Як буду маліцца я роднаму слову!

## Адкуль?

Вякамі не спазнаць той яснасці,
Перад якой пытанне ставяць:
Пасля сяброўскае адданасці
Адкуль гарачая нянавісць?

## Сапраўды

Чым болей станоўчых эмоцый,
Чым болей прыгожых ідэй,
Тым больш ты шчаслівы і моцны,
І з кожнай хвілінай – мудрэй!

## Рубаі

Няхай абыдзе бокам знатнасць,
Ды запануе ў лёсе здатнасць,
У гутарках, сустрэчах, думках
Тактоўнасць, шчырасць, акуратнасць.

# У прыцемках

У прыцемках і страх, і хараство,
Надзея на прыгожае спатканне,
І веданне ўсяго-ўсяго дазвання,
Нібы пражыта летаў гэтак сто.

Лістота з дрэваў, яблык аб зямлю,
Жаданы след нябеснае каметы –
Напэўна вестка з іншае планеты.
Ярчэйшае святло ў душу пральюць

Нарэшце мне прадстаўнікі галактык.
І ў прыцемках заўважу прыгажосць
За дзённай і вячэрняю мяжой,
Адчуўшы свой асветлены характар.

***

Выпеставаны сонейкам рамонкі,
Сціплыя званочкі, васількі,
Быццам сырадоем луг з даёнкі
З сінькаю акроплены з ракі.

Жаўранак на тонкай павуцінцы
У блакіце радасна трымціць,
Енчыць каня ля чужой крыніцы
Са сваёй журботнай просьбай «Піць».

Ластаўкі стрыгуць сабой прастору,
Дражняцца вясёлыя шпакі…
Не праходзь каля свайго учора,
Не глядзі скептычна з-пад рукі.

# Самотны лебедзь

У хвалях разам з сонейкам купаюцца
Дзве пары лебедзяў. Прыемнаназіраць,
Як побач з імі вывадак гайдаецца
Няўклюдных маладых лебедзянят.

Пад крыламі бацькоў, нібы пад ветразем,
Яны перамяшчаюцца услед:
То мыюцца ў вадзе, то вось на беразе
Па-свойму вывучаюць белы свет.

І радасна, і беды ўсе адрынуты
Табою за самотнасці мяжу,
Падобна лебедзям трымаеш спіну ты
І… раптам з воч здымаеш паранджу.

У тых жа водах воддаль хвалі лебедзя
Гайдаюць абыякава. І ён
Ужо, відаць, не раз рабіў агледзіны
І позіркі кідаў. Але праклён

Не вырываўся з горла яго мужнага,
Маўкліва ў скрусе адплывае ў небасхіл.
Напэўна, мора невясёлай лужынай
Здаецца адзінокаму. Грахі

Ён за сабой не ведае, не помняцца…
Пакутуе за што? Чаму адзін?
Ад радасці чужой, пакуль не стоміцца,
Бяжыць, каб адпачыць сярод ільдзін.

***

Прыехаць бы на Мсціж свой леташні,
Калі былі мы значна лепшымі.
Каб па лугах прайсціся босымі,
Умыцца б травамі нам роснымі,
Каб сонцам ранішнім уцерціся
Ды на вясёлку абаперціся,
Сказаць самім сабе, што весела
Пабыць у краі сваім песенным,
Хоць у цяперашнім, не леташнім,
Каб нашы думкі сталі лепшымі.

# Не астудзі

Студзёная вада ў лясным калодзежы
Спыняла нас – з грыбоў ішлі ці з ягад.
Зачэрпваючы ў слоікі парожнія,
Так праганялі стомленасць і смагу.

І абліваліся да галавы сцюдзёнасцю,
Да захаплення, радасці і шчасця…
На ўсё жыццё здаволена натхнёнасцю,
Што ўліта ў сэрца мне ў бацькоўскай хаце.

Сцюдзёнасць раніцы, сцяжынкай роснаю,
Не, не іду – бягу ўслед за буслямі,
Ізноў лунаю над сваімі вёснамі,
Дзе песнямі зайздросна ўзгадавана.

Не астудзі мяне, вада з калодзежа,
Той памяці прыгожае. Не з ягад –
З гадоў няблізкіх крочу асцярожна я,
Каб наталіць па родным краі смагу.

# На Гоцкім беразе

Я тут адпачываю ад няпраўды –
Упершыню мне вольна за мяжой.
І моўныя бар'еры супраць здрады
Не пакрываюцца славеснаю іржой.

Тут не пасе мяне суддзя златвесны,
Каб выселіць ганебна назаўжды…
Я так хачу спяваць шчасліва песні,
І прыпадаць да слоў, як да вады,

Што чыстаю крынічкаю бруіцца
Сярод маіх, а не замежных траў…
Чаму душа і ў старасці баіцца,
Каб хто яе свабоду не забраў?

Цікава, на якой жа гэта глебе
Гадуецца нікчэмнасць, каб вось так
Цябе прымусіць аб духоўным хлебе
Не ўспамінаць. Каб зноў жывы мастак,

Або паэт, пісьменнік, кампазітар
Жыў у нішчымніцы ў той час, калі
Пануюць і смяюцца з нас адкрыта
Гаспадары яшчэ маёй зямлі.

# Танка

З дабратою мне
Не цёпла, а балесна:
Бо злоснік, рукі
Ля кастра сагрэўшы,
Як вуголле, сэрца затаптаў.

***

Мы часта любім тых, хто нас не варты,
Хто пазбаўляе смеласці спакой,
Схіліўшы ўсё на кепікі і жарты,
Абы не заміналі пад рукой.

І, як заваркі даўняе гарбата,
Гарчэюць думкі з новым адкрыццём:
Як часта любім тых, хто нас не варты,
Узбунтаваўшы лёс свой і жыццё.

## Не аддай другому

Не аддай мяне другому,
Зберажы,
Каб пасля жыццёвай стомы
На мяжы
Не адзін ты быў аднойчы –
Хоць заплач.

Скажаш мне, зірнуўшы ў вочы:
«Ты прабач
І даруй мне ўсё дурное,
Тую злосць,
Добра, што ізноў са мною
Маладосць».
Маладзее пасля грому
Ўраз зямля…
Не аддай мяне другому
І…пасля.

# Асот і крапіва

Дзе ягады маліны –
Заўсёды крапіва.
Там зайздрасць, здзекі, кпіны,
Дзе пекная ўдава.

Дзе залатыя ружы –
Расце густы асот.
Жыве з нікчэмным мужам
Пяшчота з года ў год.
А дарагі пярсцёнак
На пальцы пустальгі.
Гарыць шчаслівы золак –
Дзе холад і снягі.

І так па лёсе кружаць,
Нібыта двойчы два,
Маліна дзе і ружа –
Асот і крапіва.

***

Я размаўляю з нематой:
З нямымі сценамі і столлю,
З крыштальнай вазаю пустой,
Напоўненаю звонкім болем.

Я размаўляю не з табой,
Калі ўтрапёная, нямая.
Мне не патрэбны звонкі боль
І ваза на стале пустая.

Адмоўлюся ад нематы
І стану шчыраю з табою,
Як толькі вазу ўквеціш ты
І сэрца вызваліш ад болю.

***

Згарае восень у рабінавым пажары,
У вогнішчы таполяў і бяроз,
А ў прысаку лугоў вясна – як мара,
Там грэе рукі мой замёрзшы лёс.

Надзея цепліцца і ў зімні дзень нястомна,
Вяртаючы пажары з забыцця,
І целу аднаўляючы прытомнасць,
І асалоду з прагай да жыцця.

Усмешкай на далонь упаў лісточак,
Гарачым пацалункам для вачэй…
О, як даўно не мроіла нішто так,
Як апынуцца ля тваіх плячэй.




# Аляксандра Грыцкевіч

Нарадзілася 1 красавіка 1943 г. на Міншчыне ў мястэчку Чырвоная Слабада (былая Вызна). Сярэднюю школу скончыла ў г. Чашнікі Віцебскай вобласці. У 1962 г. паступіла на матэматычна-механічны факультэт Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта (аддзяленне астраноміі). У 1967 г. атрымала дыплом. Працавала як праграміст у Пензе, Маскве, Санкт-Пецярбургу, настаўніцай у вёсцы Лыскі Чашніцкага раёна, у будаўнічым трэсце №19

горада Ліды. Жыве ў Мінску з 1983 г. Першая кніга вершаў «Адлюстраванні» надрукавана у 2013 г. Кніга перакладаў на беларускую мову розных аўтараў «Рэха вякоў» выйшла ў 2015 г.

Шляхетны ліцвінскі род Грыцкевічаў належыць да гербу «Харугва».

## Memento*

За дротам,
з калючкамі дротам,
грудок парастае асотам…
А, можа, няма
ні якога грудка,
а толькі калючая жухне трава.
А можа быць,
нават травы там няма,
А дзікая тундра,
вятры і зіма.
І месца не мае наймення.
І спрэс там імхі ды каменне.

Абое дзяды мае там паляглі.
Даведку – за што – атрымаць не змаглі
Ні мы,
ні тыя,
якіх пахапалі,
Як быццам
не існавалі.
Ў Сібір і на Поўнач,
у ямы,
у роў
Лілася ракою гарачая кроў.
Ліліся сірочыя слёзы,
Як сок веснавы у бярозы.
Там косці людскія цягалі звяры.
Там скуру з'ядалі ушчэнт камары.
Там рэзалі шчокі ў палосы
Пурга, галаднеча, марозы.

* Помні, памятай (*лат.*)

За дротам,
    за дротам,
        за дротам
На Поўначы ўсё патанула.
А модлаў нат неба не чула.

І менела добрых, разумных людзей,
І цешыўся вельмі ў Крамлі ліхадзей,
Што новую вывеў пароду
З савецкага назвай народу –
Рахманых, зайздросных і хцівых,
Да працы заўсёды лянівых.

Знішчаўся у лепшых людзей радавод
Пад корань на нашых абшарах.
Драбнеў і рахманым рабіўся народ,
А хто не такі – той на нарах!

Ну што ж, не народзіць сава сакала,
А толькі такога, якая сама.
І маем мы тое, што маем.
Пад совамі ціха здыхаем.

Што гэта было? Не магу зразумець –
І здзекі. І кроў. І фанфарную медзь…
У імя чаго і навошта
Такія вялікія кошты?

# Праўда пра боль

## (паводле павучанняў Буды
## да першых паслядоўнікаў у садзе Газэляў)

Першы боль – нараджэнне –
воλі боскай узмах.
Боль апошні – ўжо смерць.
Паміж імі –
Жыццё –
выбрукаваны шлях
Болем з назвай і болем без імя.

Аб'яднанне з нялюбымі –
моцна баліць,
Паміж любымі боль – развітанне.
Боль – хвароба, нуда,
немагчымасць да мэты даплыць.
Неспатоленасць – боль
у жаданні.
Боль у сэрцы. Мы з ім
і жывом, і памром,
Ўсведамлення працятыя дзідай.
Найвялікшы і з іх
той, што паліць агнём.
Мае назву –
няволя Радзімы.

На нябачаных шалях
узважыцца ўсё,
Што балела
і што не балела.
Кіне позірк назад,
кожны меўшы жыццё,
Усяго стане сэнс зразумелы.

***

Не шукай у бальніцы здароўя.
Не чакай ад суда правасуддзя.
Вось сумленне канае пад плотам,
Без яго абыходзяцца людзі.
Зло пануе ў абдымку з Законам.
І не варты рубля зараз гонар.
А хто мае яго, той здаецца
Паміж чорнага белай варонай.
Ходзіць Плачка ў парваным адзенні,
Душыць грудзі ёй пах алкаголю.
Пазакідваны смеццем надзеі
На жыццё і на вольную волю.

***

*Ул. Караткевічу*

Посвісты ветру
ў разбураных вежах.
Пад капытамі
верасу
звон.
Скрыпка дрыгвы
й верасовых пустэчаў,
Ты назаўсёды
забрала ў палон
Сэрца маё.

Векавечныя сосны,
Каржакаватыя
ў жылах дубы
Сівых легендаў
пільнуюць
аповесць.

Хто мы былі
і кім сталіся мы?
Скрыпка спявае
вадою азёрнай.
Скрыпка спявае
рачною вадой,
Шолахам лісця,
травамі ў росах,
Радасцю,
гневам,
слязой і нудой.

Скрыпка спявае,
прарочыць сустрэчу,
Кліча ляцець нас
у далеч
да зор
Праз развітанне
ў Спатканне адвечнае
Ў пушчах нябесных
між светлых азёр.

***

Маімі суразмоўцамі былі
Ад самага дзяцінства кнігі.
Ўсе таямніцы неба і зямлі
Яны мне паступова расчынілі.
І жарсці марныя, што ў сэрцах існуюць,
І злосці вір, і дабрыня людская,
І хвалі пенныя, што ў далячынь бягуць,
І зорны свет, што душу працінае.
Людзей сівой даўніны бачу з кніг,
Што іх цікавіла і што іх хвалявала.
Размова з імі кожны існы міг
Зрабілася маёй звычайнай справай.
Той заклікае сэрца бунтаваць.
Той суцяшае. Трэці мудра радзіць.
Між іх, як між таварышаў, душа
Сваё уласнае паняцце ладзіць.
З адным згаджаюся, спрачаюся з другім,
А трэці недавер'е выклікае.
Зусім, як паміж звыклымі людзьмі,
Жыццё маё між кнігаў працякае.

# Нататкі дылетанта

## Пра узнікненне рускай мовы

Калі «вялікі і магутны»
кавалі ў Піцеры,
сабраўшыся нячутна,
Міхайла Ламаносаў і Дзяржавін,
да іх у публікі не мелася пытанняў.
Бо рознамоўнымі былі народы.
Арыстакратам быў французскі да спадобы
ў той даўні час. Агульнага не мелі.
Масква з Калугаю зусім не разумелі
адна другую, а тым больш татары,
арду з'яднаўшыя на тых абшарах.

Царыца-немка хітра падыходзіць
і пастулат жалезны вынаходзіць:
каб збіць імперыю у маналіт
патрэбны – вера, мова і агульны міт
пра яйкі, што з адной кашолкі.
І сціхнуць на абшарах крыватолкі.
З агульнай моваю
татарын і тунгус,
Башкір, пярмяк і фін
і іншых многа
рускімі пастануць,
«*обрящут речь*» і бунтаваць не стануць
супраціў трона у адзінай веры,
бо мова скруціць дрэнныя намеры.
З вялікім вельмі «прымесам ілжы»
гісторыю напіша Карамзін.
За ім паўторацца адзін ў адзін
ўсе міты пра агульнае славянства,
пра Рурыка дынастыю у панстве,

«старэйшых» статус для сябе прысвояць,
а землі «маладзейшых» перакрояць.
Усё, што вымысляць,
як летапіс запішуць.
Няхай цяпер сядзяць цішэй, як мышы
пад венікам, скароныя народы.
Для развіцця свайго у іх няма нагоды.

Ды выйшла мова ў іх «*зело*» карава.
На шліхаванне турку далі права.
Амбітны і старацельны Жукоўскі
даў мове каларыт турэцка-львоўскі,
ў славянску вязь балгар
ўнёс цюркскія адценні.
І гэта так было. Руку на адсячэнне
Даю.
Аднак ізноў выходзіць слабавата.
І імператар не шкадуе «*злата*».
Ліцэй загадвае зрабіць
ў Сяле тым Царскім.
І юнакоў збіраць туды дваранскіх
найлепшых.
Іх вучыць
і ім магчымасць даць
сябе на розных мовах забаўляць.
Настаўнікаў паставіць наймудрэйшых.
Хай вучаць іх пісаць трактаты, вершы.
Усё дазволена, каб вынік атрымаць…
З’явіўся Пушкін. Вершы стаў складаць.
Ён мову шліхаваў.
Як дыямент «Кімберлі».
І рускія калмыкі не памерлі.
АЛЕ
«арапска кроў» пачне ўскіпаць.
Стаў Пушкін гучна ВОЛЮ выклікаць.

А РУСКІМ ВОЛЮ нельга дазваляць,
Якія ёсць кангламерат народаў малых:
Мудрэйшыя з «жыдоў»,
астатнія з «адсталых».
Прыціснуў добра ўсіх «ВЯЛІКІ І МАГУТНЫ».
Дасюль ад тых часоў
нас «ВЕЛІЧНАСЦЮ» мучыць.
Заблыталіся ў гэтай павуціне,
паверыўшыя ў міт,
і мусяць ціха гінуць.
Імперскі ж дух жывы
й ніколі не пакіне
АРДУ,
з'яднаную пад птушкай
двухгаловай,
І з лютай ненажэрнасцю
дзяўбсці
І Захад, і Усход,
заўжды гатовай.

# Свойская бяседа

Свінка рохкае ў хляве:
– Йдзіце ў госці да мяне.
Я ўсё хораша прыбрала
І абед прыгатавала.
Вось бацвінні цэлы цэбар*,
Можна есці і без хлеба.
Бульба добрая ў кашы.
Хрумкай, Рэкс, і не брашы,
Што частую вас нясмачна.
Тое самае зазначыў,
Бачу, шэры Васька-кот,
Смачкаед і абармот.
Мяса, пэўна ж, я не маю,
Зато шчыра сустракаю –
Калі ласка, рох-рох-рох –
Вось і пражаны гарох.
Разам з морквaю капуста…
Носам круціце, распусты!
Вам смятанку падавай…
Гэй, давай, Васіль, спявай
Пад шампанік з бурачкоў…
Рэкс, заводзь, я падтрымаю.
Як жа слаўна мы спяваем!
Мяу-мяу, рох-рох-рох,
Гаў-гаў-гаў – трашчыць гарох.
І бацвінню ўсю паелі…
Як жа добра пасядзелі!
Дзякуй, госцейкі, за гонар,
Што майму зрабілі дому.

* Цэбар – невысокае, не болей за паўметра, а часам і меней, драўлянае вядро з вушкамі.

# Мініяцюры

***

Вось сінагога і касцёл,
Царква. А Бог адзін усё ж.

***

Зямля адна. На ёй жывем.
Бясконца дзелім, кроім, рвем.
Не можам Бога падзяліць.
Бо ён адзін. Што нам рабіць?

***

Даюць – бяры, б’юць – уцякай, –
Ці ёсць якая праўда ў тым?
То філасофія раба.
Рабі так, як быць хочаш ім.

***

Рагоча ў цёмным лесе лось:
– Мы заўтра выбярам кагось.
Казюлькі вырашаць за ўсіх,
Бо ў лесе, пэўна, большасць іх.

***

Карэннем моцным дуб урос
У землю родную сваю.
Вакол яго віецца лёс
І мой, і тых, каго люблю.

# Пераклады

## Рыгор Шырман (1898–1956)

***

На глінянай Зямлі, у тлене і іржы
Блукае бессьмяроцьце ў чалавеку.
У вышыню ён падымае вейкі
І чэрпае ад вечнасьці дзяжы.
Няма вачэй паўней, а ёсьць нажы
Вастрэй, чым позірк ворага навекі.
Сыны, Ісак з Якубам, ад Рэвекі
Глядзяць так, вочы ў вочы на мяжы.
І жорсткі бунт галодны не адменяць.
Вада з крывёю разам заструменяць.
Камэны* аглушоныя маўчаць.
Толькі віхор пыл кружыць ад іх страты.
І зорак сьцелецца ліловы чад.
І над Зямлёй вагонь плыве хвастаты.

* Камэны (Camenae, старажытная форма carmenae) – старажытнаіталійскія бажаства, якія нібыта былі насельнікамі ў крыніцах і ручаях каля храма паганскай багіні Весты.

## Уільям Шэкспір (1564–1616)

## Санэт 66

Заву я сьмерць. Нясьцерпна бачыць мне,
Як годнасьць з торбай дранаю вандруе.
Распуста на цнатлівых бруд ліе.
Нікчэмнасьць недарэчнасьць ганаруе.
Ў палоне немачы бяззубай моц
І справядлівасьць пад вайсковым ботам.
І кляп, засунуты натхненьню ў рот,
І дасканаласьць ў дзёгці і за дротам.
Пад маскай знаўцы, ўзяўся ніадкуль,
Не бачыць далей за свайго парога,
Картуе дурань лёс людзей пакуль,
Надзею мецъ магу толькі на Бога.
Мярзотна ўсё, што бачу навакол.
Калі б ня ты, даўно б зышоў у дол.

## Мікалай Забалоцкі (1903–1958)

### Не дазваляй душы...

Не дазваляй душы ляноту.
Ваду у ступе не таўчы.
Павінна мець душа работу
Твая ад ранку да начы.

Не патурай, калі бушуе,
Як голасна яна раве.
Астатнюю зь цябе кашулю,
Расперазаўшыся, сарве.

Гані яе, гультайку, з дому,
Цягні за шкірку, за каршэнь,
Праз бездарожжа, буравоны.
І ў ноч, і ў дзень. І ў ноч, і ў дзень.

Не дазваляй ёй спаць ў пасьцелі
Пры сьвеце ранішняй зары.
Трымай гультайку ў чорным целе,
Усе прысмакі адбяры.

Хапай мацней яе за плечы,
Вучы і мучай да цямна,
Каб жыць з табой па-чалавечы
Прызвычаілася яна.

Табе служанка й каралева,
Якую трэба берагчы.
Няхай працуе без сумневаў
З табой ад ранку да начы.

## Сяргей Ясенін (1895–1925)

***

У жыцьці усё мана з журбою,
Ды яно чаруе ўсіх сабой,
Бо на ім прарочаю рукою
Тойма лёс выводзіць напіс свой.

Я заўжды, калі заплюшчу вочы,
То кажу, ледзь сэрца закрані:
- Ўсё – мана, але, калі захочаш,
То зазьзяе праўда у агні.

Добра мне ў чаромхавай завеі
Пра жыцьцё, як сьцежку узгадаць.
Хай каханак лёгкіх вецер зьвее,
Хай сябры, што здрадзяць, адляцяць.

Хай мяне пяшчоты цешаць словы.
Брытвай рэжа злосны хай язык.
Я жыву да усяго гатовы,
Да ўсяго бязьлітасна прывык.

Глянь парою на сівое неба,
Глянь на ветах і скажы сабе:
– Спакайней, сьмяротны, мо' ня трэба
Праўды той, што спапяліць цябе.

Холадна душы у гэтай высі,
Толькі зоры ціха мільгацяць.
Тыя, што любіў, даўно зракліся.
Кім я жыў, мяне ня хочуць знаць.

Але, хай, прыгнечаны, ганімы
Буду сьвятло сонца услаўляць
На зямлі мне блізкай і любімай,
За жыцьцё каб «дзякую» казаць.

# Ганна Ахматава (1911–1966)

***

Адны ў ласкавыя глядзяцца вочы.
Другія п’юць і цешацца гульнёй.
Я ў перамовах паміж цёмнай ночы
З неўтаймаванай совесьцю маёй.

Кажу я ёй: «Твае я нараканьні
Нясу шмат год і гнуся ад ярма.»
Ды час ў яе ня мае існаваньня,
Як і прасторы паміж зор няма.

Ізноў ахутаў чорны душны вечар
Злавесны парк, нясьпешны бег каней,
І поўны шчасьця з весялосьцю вецер,
З кручаў нябёс зьляцеўшы на мяне.

А нада мной суворы і двухрогі
З’явіўся сьведка. О, туды, туды…
Па старажытнай ледзяной дарозе,
Дзе лебедзі між мёртвае вады.




# Яўген Гучок

Нарадзіўся ў 1940 г. у Слуцку ў рабочай сям'і. Пасля заканчэння 9-й сярэдняй школы працаваў у геалагічным атрадзе, на мэблевай фабрыцы. Тры гады служыў у войску. Скон-

чыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і аспірантуру пры ім. Працаваў настаўнікам. Вучыўся ў Маскоўскім паліграфічным інстытуце. З 1971 па 2001 г. быў на пасадзе вядучага рэдактара ў выдавецтве «Народная асвета». Друкавацца пачаў з 1959 г. у слуцкай раённай газеце. З'яўляецца аўтарам кніг паэзіі, прозы і публіцыстыкі: «Белое чудо», «Блакітныя чмялі», «Сэрцам і думкай», «Истоки пути», «Формула травы» (два выданні), «Чаму мы страцілі этнонім «Літва», ці Да гісторыі аднаго рабства», «На патрэбу душы», «Nekropolis», «Ах, Родчанка», «Беларусь у магдэбургскім праве», «Альгерд Абуховіч», калектыўных зборнікаў, альманахаў, рознай перыёдыкі. Перакладае з іншых моў на беларускую. Яго творы друкаваліся ў Расіі, Польшчы, Чэхіі, ЗША, Індыі. Даследуе пытанні роднай гісторыі і культуры. Жыве ў Мінску.

# Слова да чытача

Беларускі паэт Яўген Гучок, які нарадзіўся ў Слуцку, стварыў паэму-эсэ пра свайго земляка і майго дзядзьку прафесара педагогікі Фаму Бельскага (1890–1952) да 125-годдзя з дня яго нараджэння. Напісаў яе, не буду ўтойваць гэта, па маёй замове. Тут можна згадаць добра вядомую літаратурную аналогію. Калісьці ў Рыме папа Леў X звярнуўся да паэта Міколы Гусоўскага з просьбай, каб той напісаў пра паляванне на зубра. Прыкладаў замовы, у тым ліку сацыяльнай, у літаратуры нямала. Мы памятаем, што Гусоўскі ў сваім творы не толькі яскрава намаляваў вобраз зубра, але і стварыў пранікнёную патрыятычную песню пра наш беларускі край, асэнсаваў значныя праблемы свайго часу. Пасля знаёмства з паэмай-эсэ «Пакутнік-пілігрым», я пераканаўся, што паэт Яўген Гучок распавёў не толькі пра драматычны лёс вучонага-асветніка Фамы Бельскага, але і здолеў выйсці на ёмістыя і глыбокія сацыяльна-філасофскія абагульненні пра радзіму і повязь з роднай зямлёй, чалавека і час, асобу вучонага і яго пазіцыю, прызначэнне педагогікі і навукі, яе адносіны з уладай і палітыкай, ролю школы і настаўніка, адукацыі і культуры ў жыцці грамадства.

Хто ж ён, Фама Бельскі, якому прысвяціў цэлую паэму Яўген Гучок?

Фама Бельскі – філолаг, вучоны ў галіне педагогікі і псіхалогіі, краязнавец, музеёлаг, педагог. Ён нарадзіўся ў славутым мястэчку Цімкавічы Слуцкага павета (цяпер гэта Капыльскі раён). Яго дзед Сільвестр быў выпускніком літаратурнага факультэта Віленскага ўнівер-

сітэта, вучыўся ў адзін час з Адамам Міцкевічам, Ігнатам Дамейкам і іншымі філаматамі ды філарэтамі. З сярэбраным медалём Ф. Бельскі скончыў Слуцкую гімназію (1909), Кіеўскі ўніверсітэт з дыпломам першай ступені (1913). З 1925 года – прафесар педагагічных навук. Ён стаў першым значным вучоным з мястэчка Цімкавічы і Капыльшчыны ў XX стагоддзі. Працаваў ва Украіне, у Беларусі, Расіі, Узбекістане. У даваенны час у Магілёўскім пединстытуце ён быў стваральнікам кафедры педагогікі і псіхалогіі, яе загадчыкам.

Усе свае лепшыя працы Ф. Бельскі напісаў на ўкраінскай мове ў 1920-я гг. Ён добра валодаў некалькімі замежнымі мовамі, але заўсёды ў лістках па ўліку кадраў пазначаў сваю родную – беларускую. Дарэчы, у Магілёве, будучым настаўнікам і маладым літаратарам, лекцыі ён чытаў па-беларуску. Многае ў біяграфіі і творчай дзейнасці Ф. Бельскага пазначана словамі «першы» ці «ўпершыню». Ён быў адным з першых прафесараў Данецкага інстытута народнай адукацыі і Магілёўскага педінстытута, пачынальнікам музейнай справы і краязнаўчага руху на Луганшчыне, ініцыятарам стварэння першых навуковых таварыстваў на Данеччыне, школ для таленавітых дзяцей і інш. Вельмі шмат часу аддаваў працы з літаратурна адоранымі дзецьмі і студэнтамі. Гэта ён надрукаваў першы пераклад з французскай мовы будучага славутага паэта Украіны Міколы Зэрава з якім разам вучыўся ў Кіеўскім універсітэце, а затым працаваў у Златапальскай гімназіі.

У 1932 г. прафесар на вучоным савеце Херсонскага педінстытута выступіў з крытыкай метаду політэхнізацыі, і гэтае яго выступленне

і пазіцыя былі расцэнены як ідэалагічна нявытрыманыя, варожыя. Фаму Антонавічу пагражалі пазбаўленнем права выкладаць у ВНУ, рыхтаваліся дакументы на арышт. З гэтага часу і пачынаюцца ўцёкі, вандраванні вучонага па Савецкім Саюзе. Усе цяжкасці і нягоды з ім раздзяліла яго жонка, верная спадарожніца жыцця Кацярына Міхайлаўна. На жаль, Фама Бельскі сталінскую ўладу не перажыў, да апошніх дзён жыцця марыў вярнуцца ў родныя Цімкавічы. Не стала яго ў 1952 годзе. З 1931 па 1943 г. вучоны не надрукаваў ніводнай працы, якая нейкім чынам скампраметавала б яго. Гэта быў свядомы і сумленны выбар вучонага. І толькі ў гады вайны з'явіўся яго артыкул з красамоўнай назвай «Фронту культуры і асветы патрэбны высокакваліфікаваныя кадры настаўнікаў» (1943).

Пра жыццё і дзейнасць Ф. Бельскага апавядае кніга «І прызнанне, і лёс» (2012), а таксама дзясяткі артыкулаў у беларускім і ўкраінскім друку, яго імя фігуруе ў шматлікіх энцыклапедычных і даведачных выданнях: «Беларуская энцыклапедыя», «Беларускае замежжа», «Сузор'е беларускага памежжа» і інш.

Неардынарнай асобе і лёсу вучонага прысвяцілі свае вершы С. Панізнік, В. Стралко, Л. Забалоцкая, С. Чыгрын, А. Петрушкевіч, В. Рагаўцоў, А. Гібок-Гібкоўскі і інш. Мне імпануе ўдумлівае, разважлівае інтэлектуальна-філасофскае слова Я. Гучка, таму яго паэму-эсэ з прыемнасцю прапаную ўвазе чытачоў «Нашага слова».

*Алесь Бельскі, доктар філалагічных навук, прафесар, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя І. Мележа*

# Пакутнік-пілігрым

## паэма-эсэ

*Светлай памяці вучонага-педагога,*
*прафесара Фамы Антонавіча Бельскага*
*(1890 – 1952)*

### I

***

Вучонага веравызнанне – веды,
А храм яго –
Ўвесь Божы свет.

***

Канон і рытуал сапраўднае навукі
Закладзены на перспектыву –
На святло.

***

І ў навукі вочы ёсць,
А колер іх – нябесны,
І ў глыбіню нябесную яны ўзіраюцца.

***

Не ўсё ў чалавеку сапсавана,
Заўжды ў яго становучая ёсць рыса;
Галоўнае – яе заўважыць навукоўцу-педагогу.

***

Заўжды навука – шчодрая…
Ў залежнасці ад шчодрасці
Тваёй істоты.

***

Калі вучоны – не паэт,
Вядома, ў пэўным сэнсе,
Дык будзе мецць ён крылы пеўня.

## II

***

Наваградак, Мсціслаў, Капыль
І іншыя мясціны Беларусі
Й сваім рэльефам да Швейцарыі падобны.

***

А княства Слуцкае ў ВКЛ
З зямлі Капыльскай
Пачыналася.

***

Зямля Капыльская,
Як складнік Случчыны і Беларусі
Заўжды была на таленты багата.

***

Хіба абыдзем памяццю Малевіча,
І Цішку Гартнага, і Чорнага, і іншых?!
Лёс і да іх не літасцівы быў.

***

Як добра родны край пазнаеш,
Дык і планета і Сусвет
Табе чужынцамі не будуць.

## III

***

У Слуцак, у «Афіны Слуцкія»*,
У Слуцкую гімназію
Кіруецца Фама – Антонаў сын – вучыцца.

---

* «Слуцкімі Афінамі», «узорнай слуцкай гімназіяй» называлі за рэгламентаванае жыццё школы, парадкі і сістэму навучання, выпрацаваныя там яе статутам.

***

Ліцэя Слуцкага статут
З'явіўся імпульсам стваральным
«Вялікае дыдактыкі» у чэшскім краі.

***

Пад дахам Слуцкае вучэльні
Лунаў над педагогамі і вучнямі
Дух Лока, Песталоцы і Русо.

***

Сіньёры* беларускія ўзгадвалі сабе
і навучэнцам
Кірылу з Турава, Ефрасінню
і Францішка з Полацка,
Сафію Слуцкую, Цяпінскага, Лышчынскага
і іншых.

***

З аўдыторый знакамітай той вучэльні
Сярод выпускнікоў яе вядомых
Былі і Капіевіч, і Абуховіч, і Цэраскі…

***

Медалёвае срэбра «Слуцкіх Афін»
Фаму-юнака цімкавіцкага
Паклікала ў Кіеўскі ўніверсітэт.

---

* Так звалі настаўнікаў і выхавальнікаў Слуцкага ліцэя-гімназіі.

## IV

***

Як час ляціць! О alma mater!
Бывай, прасветлая карміцелька духоўная!
Цяпер – у свет, у людзі, ў школу.

***

Спадзвіжнік таленту,
Вядома, – праца, праца
І яшчэ раз – праца, свабодная, натхнёная.

***

Што без маральнага падмурку веды?!
Што?!
Яны вядуць да хітраванства і прыстасаванства.

***

Як педагог – палоннік розуму і сэрца,
Такімі ж будуць яго вучні
І адэпты.

***

Па адным і ўсе разам адначасова
Вучні твае – аранжэрэя нібыта;
Ты ж – руплівы для кожнага кветкавод.

***

Заўжды: і ў вучэльні, і дома –
Нябачна душа настаўніка
Апякуецца постаццю вучня.

***

Сапраўдны педагог!..
Ён і сабе, й настаўнікам –
Настаўнік.

***

Хай навучэнцы ведаюць,
Што і спіны педагогаў –
Надзейны і выратавальны шчыт.

***

Калі ж, нібы мякіна, мяккі педагог,
Граніт навукі да сябе
Мякіністых не падпускае навучэнцаў.

***

І прыкладам у яго рабоце
Былі заўжды
Таксама й «Слуцкія Афіны».

***

Музей – не маўзалей…
У музеі навуковым
Жывой гісторыі сляды адбіты.

***

А што асоба ёсць?!
То шырыня і дабрыня душы
І светлы розум адначасна.

***

Грамадства без эліты – не грамадства,
Няма грамадства –
Няма поўнакаштоўнага жыцця.

***

Й механізатару быць робатам –
Не годна;
Ён, да ўсяго, асобай быць павінен.

***

І фізкультурнік будзе
Пераважна больш культурнік,
Калі яго асобу настояць на святле.

***

Даволі пра бар’еры!
Даволі пра заслоны!
А ў грамадстве быць эліце!

# V

***

Не, педагог флюгаркай быць не можа;
Калі ж інакш,
Тады ён – проста прыслугач.

***

Такім быць, як усе, –
То лёс манкрута і духоўнага кастрата…
Авохці мне! Авохці мне!

***

І чым святлейшыя пасылы ў навукі,
Тым болей цёмных перашкод
Ёй на шляхах яе рыхтуюць.

***

Хіба навука можа
Крылы мець і распраўляць іх,
Калі жыццё вучонага ў небяспецы?!

***

Зрываюць светлыя галовы з месца і жыцця
Зайздроснікі і цікуны, й даносчыкі…
А сёння безліч іх наўкол.

***

Падкоп пад навуку,
Яе зневажанне –
Калясмяротны прысуд вучонаму.

***

Калі замест сур’ёзнасці ў жыцці –
Страх арышту, а то й расстрэлу,
Прабачце, пра які прагрэс тут можа
быць гаворка?!

***

Грамадства спіць… не проста спіць,
А, да ўсяго, пахропвае магутна…
Навука і вучоны сабе такое не дазволяць.

***

Куды на абавязках ты заедзеш,
Калі ў цябе правоў няма?!
Вядома,  – ў нікуды.

***

Так, пры ўладзе блуднай
Сябе адчуеш ты міжвольна
Выгнаннікам, вандроўнікам гаротным.

***

Гадзі́ць такой уладзе –
Душы уласнай і навуцы
Толькі га́дзіць.

***

І гора, і бяда краіны,
Калі ратуецца-вандруе безупынна
На ўласнае выратаванне педагог.

***

Беззаконне трывожнага часу
Пазбаўляе маёмасці і жытла
І ў страху ганяе людзей па свеце.

***

Уцёкі, уцёкі…
Кіеў, Херсон, Магілёў, Бухара, Ленінград…
Вось табе і «*этапы большого пути*».

***

Вучоны ў загоне! Куды падацца?!
У загоне й Радзіма яго…
Бяда! Гора! І заняпад!

## VI

***

І па архівах шнараць-шукаюць,
І допыты ладзяць наўкола
У незалежных адносна настаўнікаў сёння.

***

І дзесьці побач – ў Казахстане і ва Узбекістане
Ратуецца Сцяпан Ліхадзіеўскі –
Паэт, літаратуразнавец, перакладчык.

***

Схіляйма нізка галаву
Перад сябрамі вернымі і жонкамі адданымі
Вандроўнікаў-пакутнікаў-вучоных.

## VII

***

У брудную палітыку
Навуку выхавання
Імкнуцца брудныя палітыкі ўцягнуць.

***

Падмацаванае вучэнне зброяй
У хуткім часе ператворыцца
У заканурак зачухмыраны.

***

Што можа узвышацца над навукай?!
Жыцця падаўца – Творца
Ці часам нечысць сацыяльная.

***

На воз навукі, фігуральна кажучы,
Сягоння, годных адпіхаючы,
Шчымліва лезуць невукі і інтрыганы.

***

Хто пнецца дзецям затлуміць мазгі,
Той – не настаўнік,
А без забрала назіральнік ў ролі карніка.

***

Калі мундзір з навукі робяць,
Дык лепей быць у кацавейцы ці ватоўцы
Незалежным.

***

Якое тут мора думак,
Калі ўсё зведзена да міскі хлёбава
Для навукоўца, для паэта, педагога.

***

Рэктар – прабіральшчык…
Прарэктар – прапрабіральшчык…
І такія пасады сёння ёсць у ВНУ.

***

«*Люди холопского звания…*»
Сёння іх значна болей,
Чымся калісь было.

***

Калі навука мае загароджу,
Яна, вядома, – не навука,
А загон.

***

Хтось светлую навуку акармляе
талентам сваім,
А хтосьці корміцца-жыруе з яе,
Калі ёй дыхаецца ледзь.

***

Вучэнне, што уцэнкі патрабуе,
Не мае права на жыццё,
Тым больш – на распаўсюд.

***

Калі навука й навукоўцы маршыруюць,
Вядома, куды дамаршыруюцца
Яны.

***

А хто купіруе навуку,
Той выбухоўку пад сябе
Падкладвае.

***

Вы выгналі навуку ў дзверы,
Да вас яна у вашы вокны не палезе…
Гібейце ў котлішчы сваім.

***

І як не заганяй навуку ў стойла,
Яна над гэтым стойлам
З цягам часу пасмяецца.

## VIII

***

Ў далечыні ад роднай Беларусі
Шчэ больш сябе ты беларусам
Адчуваеш.

***

Азяблую душу вучонага-пакутніка-
вандроўніка
Адаграе шчэ памяць аб Радзіме,
Адкуль пачаўся шлях яго ў навуку.

***

Каб не нялюдская ўлада, не аблудная,
Няўжо б не жыў я ў Беларусі
І для Беларусі?!

***

І Случчына, а ў ёй Капыльшчына,
А ў іх і Цімкавічы, як і Беларусь,
Былі калісь адкрытымі, адданымі сябрамі.

***

Такі ўжо лёс у нас у беларусаў –
Вяртаемся дамоў,
Каб зноў свой дом пакінуць.

***

«*Люблю Отчизну я, но странною любовью…*»;
«*Слишком мало Родину любить,*
*Надо, чтобы и она тебя любила…*»

## IX

***

І між украінскіх сяброў
Так многа беларускага
Пачатку.

***

Як быць не ўдзячным Украіне?!
Там распраўлялі свае крылы
Сам Багушэвіч і сама Пашкевічанка – Цётка.

***

Беларусізацыя! Украінізацыя! –
То планетарнага маштабу правакацыі,
Каб дух нацыянальны ў народаў вынішчыць.

***

Дзе сябра мой, універсітэцкі аднакашнік,
Украінскі паэт і навуковец Мікола Зэраў?!
Як і многіх іншых, яго жыцця пазбавіў НКУС.

***

Як падрахунак тых «працэсаў»,
Ды яшчэ ў прыдачу –
І Курапаты, і галадамор.

***

Так многа горычы ў тых шляхах
выратавальных,
Але яны жывая повязь
Між народамі.

***

На могільніку Байкавым у Кіеве,
Дзе спачывае геніяльны і трагічны Палуян,
Знайшоў прытулак вечны вучоны з Беларусі
Бельскі.

***

А дальш на поўдзень, ў Крыме
Спіць вечным сном зямным
Краса і гонар Беларусі – Багдановіч.

## Х

***

Навука – не мода і не фарсуха,
Але заўсёды цемрашалы
Яе імкнуцца асядлаць-перафарсіць.

***

Так, ёсць яшчэ навука – бы прыгожая фіранка,
Што не дае пабачыць
Велічы Сусвету.

***

Паміж навукай і жыццём – канва жывая
А між навукай і дактрынай –
Непераходная канава.

***

Праз даляглад, што далучае неба да зямлі,
А не праз проразь дагматычных установак
Патрэбна навучэнцаў разглядаць.

***

Калі навуку грэе сонца,
Дык і дарога ёй да сонца;
Калі ж дайшла да аўтагена – яе чакае газавы балон.

***

Як добра, што дагматыкам не ўдасца
Цяпло й святло
Ад сонца адключыць.

***

Нябесная жыхарка на зямлі! –
Навука! Заўжды яе служыцелям
Было нялёгка.

***

Не носіць такую фуражку настаўнік,
Якая тулляй сваёй
Заўжды засланяе сонца.

***

Свядома шлях абраны на зямлі
І пры варунках неспрыяльных між людзьмі
Не будзе кабалой здавацца.

***

У сапраўднай навукі
І лямкі, і стропы
Працуюць заўжды на уздым.

***

Навуцы – светлы помнік,
А догме і дактрыне –
Вараннём упрыгожаны надгробак.

*2015*



# Ілля Копыл

Нарадзіўся 2 жніўня 1934 года ў вёсцы Нябышына Бягомльскага раёна Мінскай вобласці (зараз Віцебская вобласць). Бацькі – сяляне, калгаснікі. У 1941–1944 гадах сям’я пражывала пад нямецкай акупацыяй. У 1954 годзе закончыў Бягомльскую сярэднюю школу. З верасня 1954 года па снежань 1981 года служыў у Савецкай Арміі. Закончыў Мінскае артмінамётнае вучылішча, а потым Растоўскае вышэйшае каманднa-інжынернае вучылішча ракетных войск. Пасля звальнення з арміі працаваў на адным з мінскіх прадпрыемстваў у ваенным прадстаўніцтве на інжынерных пасадах. У 1990 годзе высоўваўся кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарсавета. Перадвыбарчую агітацыю правёў пры падтрымцы БНФ, заняў 3-е месца з 6-ці.

Артыкулы Іллі Копыла больш за 50 разоў друкаваліся ў газетах «Свабода», «Навіны»,

«Народная воля», «Наша слова». Шматразовы ўдзельнік у перадачах «Радыё Свабода».

Аўтар кнігі ўспамінаў «Нябышына. Акупацыя вачамі падлетка». Першае выданне выйшла ў 2009 годзе, другое – ў 2014 годзе. Кніга таксама друкавалася ў газеце «Народная воля» і ў часопісе «Беларуская думка» Згуртавання беларусаў ЗША, Нью Ёрк.

Ілля Копыл жыве ў Мінску.

## На перекрестке

Войны шли по Беларуси,
И несла она урон,
Распинали, как Иисуса,
Воскресала, как и Он.

Через нас идут дороги
На Москву и Петербург.
Нам земля дана от Бога
И соседи все вокруг.

Мы им дружбу предлагали,
Предлагали мы им мир,
Но в ответ они нам лгали
И смотрели, как вампир.

Императоры, генсеки,
И цари, и короли
Здесь пролили крови реки,
На Голгофу нас вели.

Шли их полчища с мечами
И крушили все кругом.
Мы в штыки врагов встречали,
Изгоняли мы врагов.

Иван Третий, Иван Грозный
На Литву идут в поход.
В летний день и день морозный –
Нападали каждый год.

Пётр Первый шел на шведов,
На Москву – Наполеон.
Наш народ от них изведал
Ужас смерти и *праклён*.

Бойня Кайзера с Антантой…
Подключилась к ним и Русь.
Больше всех от оккупантов
Пострадала Беларусь.

А потом, когда в России
Стала власть большевиков,
Снова землю оросили
Кровью наших земляков.

Был момент благоприятный,
Показали мы пример –
Стали мы страной обратно,
Мы создали БНР.

Поднялись мы, состоялись,
Нас признало много стран.
Комиссары к нам ворвались –
Из Кремля приказ был дан.

Мирных дней было немного,
Нас лишили всех святынь.
А потом вела дорога
В Куропаты и Катынь.

Мы объектом торга стали –
Аппетит к нам не угас –
Сперва Ленин, потом Сталин
На куски делили нас.

Белосток отдали Польше,
Вильня отошла Литве,
Брянск, Смоленск – куски побольше,
Отошли русской братве.

Нас жестоко убивали,
Уцелели мы не все.
Белорусы обживали
Колыму и Енисей.

Выживать было непросто –
Мы ж враги и кулаки.
Наш был Кольский полуостров,
Наши были Соловки.

Гитлер планом Барбаросса
Совершил к Москве блицкриг.
Оккупанты шли без спроса –
Настрадались мы от них.

Нас душили партизаны.
Жили мы меж двух огней.
Мы зализывали раны,
Дожидались лучших дней.

Настал год девяносто первый,
Он свободу преподнес.
Коммунисты шли со сцены,
Знаменитым стал Форос.

Еще толком мы не знали,
Что развал страны нам даст.
Коммунисты власть сдавали
И они же брали власть.

Белорусы им в угоду
Вновь остались за бортом,
Свою битву за свободу
Отложили на потом.

Президента мы избрали
Всенародно первый раз,
Но свободнее не стали,
Все по-прежнему у нас.

Нет его корней глубоких,
В нашу землю он не врос,
В нем советские пороки,
Его родина – колхоз.

Вновь объектом торга стала
Белорусская земля.
И опять нас оплетают
Паутиной из Кремля.

*1994–1995*

# Мне 80 лет

Ну вот, мне 80 лет,
Но я совсем, совсем не рад.
В моих глазах искринки нет,
Не надо, не хочу наград.

Восемьдесят. Я жить устал.
О, как же я устал страдать.
Мое сердечко как металл,
Уже не сможет зарыдать.

Восемьдесят. Звонки, звонки…
Я отвечаю всем подряд.
А мне мерещатся венки
И что я попадаю в ад.

Здесь многие попали в ад,
Таких как я тут пруд пруди,
С наградами и без наград.
От митингов тут все гудит.

Звучат здесь мова и язык,
Трасянка здесь ласкает слух.
Сюда с Кремля доходит крик:
«Котлеты отделить от мух!»

«Ты знаешь, в чем твоя вина? –
Сказал один мне генерал. –
Книгу «Нябышына. Вайна»
Ты написал и в ней не врал.

Бог обожает больше ложь.
Проще сказать – любит вранье.
Поэтому ты в рай не вхож,
В раю одно лишь воронье».

В раю сатрап Ленин-Ульянов.
Туда попал не он один,
Там тысячи таких тиранов,
Там из Кремля палач-грузин.

Там Брежнев, Ягода, Цанава,
Там Ворошилов и Ежов,
Маленков, Берия, Янаев,
Гикало, Мехлис и Хрущев.

Там Троцкий, Каменев, Зиновьев,
Калинин, Киров и Свердлов.
Они страну залили кровью,
Немало наломали дров.

Они – создатели ГУЛАГов,
По их вине царил террор,
Под их кроваво-красным флагом
Косил людей голодомор.

Там Каганович, Жуков, Пуго –
Легче сказать, кого там нет.
У каждого своя прислуга,
У каждого свой кабинет.

В раю роскошно этим тварям:
Пайки, машины, катера.
Они там пишут мемуары,
А с ада им кричат: «Ура!!!»

В раю покой и скукота,
Звучит подряд несколько дней.
Мелодия одна и та
Из «Танца белых лебедей».

Рай показушный, никакой.
В аду ж, как в банке пауки…
Не описать одной строкой,
Да и писать мне не с руки.

Писать, что в рай я не попал?
Да и в аду я новичок.
Чтоб я хоть что-то наверстал,
Мне помогал Яўген Гучок.

Он оказал помощь во многом.
Я вам скажу на это так:
Яўген Гучок – поэт от Бога
И в *трохрадкоўях* он мастак.

Опять вернусь к своим годам –
Поэзии не получилось.
Себе я этих лет не дам,
Но это так, это случилось.

Осталось доживать года.
Конечно, оглянусь назад.
Умру – не велика беда,
Если кто вспомнит – буду рад.

*02.08.2014*

## Очнитесь, белорусы!

Ах, белорус, ты ж гордым был,
Любил ты Родину, свободу.
Ну почему ты все забыл
И перестал ты быть народом.

Весь мир ты страшно удивил,
Забыл Погоню, стал несмелым.
А что сказал бы Радзивилл,
Если б узнал, что ты наделал?

Ну как же мог позволить ты
В руках чужинцев стать игрушкой?
Зачем в Европу сжег мосты?
И как ты мог забыть Костюшку?

Мы ж были мощною страной,
И не было числа победам.
Нас вел Астрожский за собой,
Он нашей Родине был предан.

Тобой ведь восхищался мир,
Ты жил свободно и обильно.
Нас обкусали, словно сыр.
Где наш Смоленск?
Где наша Вильня?

Стояло ВКЛ века,
И москалей не раз мы били.
Потом же при большевиках
Они нас много раз делили.

Народ мой, ото сна очнись
И стань, как наши предки, смелым,
Верни Погоню, взметни ввысь
Флаг Бело-Красно-Белый.

*14.05.1998*

# След москаля

Вернемся на века назад,
Посмотрим в наших предков лики,
И сделаем подсчет утрат,
И вспомним подвиг их великий.

Встречали стойко москаля,
Он рвался в города и села,
Уничтожал наши поля –
И нет предела произволу.

Он злодеяния творил,
Ломился нагло в наши двери.
Оставил много он могил –
Москаль был страшным изувером.

Он на пути все выжигал,
Везде оставил пепелища.
Там, где прошла его нога,
Признаков жизни не отыщешь.

Там, где стояли города,
Оставлены груды развалин.
Врага не звали мы сюда,
Мы москаля к себе не звали.

Наших жен и дочерей
Пленили и в Москву погнали.
Москаль, как сброд диких зверей,
Их честь и тело опоганил.

След кровоточит и сейчас,
След, что москаль у нас оставил.
Он геноцид вершил у нас,
Не соблюдая божьих правил.

За уничтоженных людей,
За наши спаленные хаты
Возмездие найдет везде.
Бог покарает виноватых.

Нам все решать надо самим.
Вопрос поставлен: «Или, или…»
Отчизну мы не посрамим,
Путь к возрождению осилим.

Недолго нам осталось ждать.
Все лучшие сыны народа
Уже готовы насмерть встать
За нашу честь и за свободу.

*02.03.2004*

## Судьба

Жил на этой земле человек,
Бог отмерил ему его век.
Он добротно построил свой дом,
Постоянно достаток был в нем.
Стены пахли смолистой сосной,
И не страшен был голод весной.
Имел лошадь, имел инвентарь,
Никому не мешал, не бунтарь.
Не хотел он вливаться в колхоз,
Хоть немало он слышал угроз.

Коммунисты засели в Кремле,
Как чума, расползлись по стране.
Они влезли во все уголки
И погнали народ в Соловки.
Сердцем чуял беду наш герой,
Ждал ареста ночною порой.
Черный ворон, угрюмый конвой…
Слава Богу, еще не за мной.
Но под утро его увели,
От родной оторвали земли.

Был отправлен куда-то в ГУЛАГ
К миллионам, как он, бедолаг.
Потерялся его где-то след,
Среди мертвых, живых – его нет.
Большевистская пуля в 36-м
Уложила его пластом.
Хоть на нашей земле очень тесно,
Где могила его – неизвестно.
Может быть, обварили его кипятком,
Может быть, прикатали катком
Под асфальтом шоссе Москва – Минск.

Не поставят ему обелиск
(Обелиски стоят палачам,
Убивающим нас по ночам).
Может быть, растворили его в кислоте
Или в вечной лежит мерзлоте?
Может он в Куропатах убит,
В безымянной могиле зарыт?
Кто ответит, в чем он виноват?
В чем виновен отец его, брат?
Может только вина его в том,
Что кормился своим он трудом,
В том, что в лодырях не ходил,
Не бездельничал, брагу не пил.

На него непутевый сосед
Сделал подлый донос в сельсовет,
Что он будто бы стал кулаком
(Так и жили все в страхе таком),
Что он будто бы польский шпион,
Что он тайно ходил за кордон.
Так боялся соседа сосед.

Так и жили мы 70 лет.

*1997–1998*

# Путь к свободе

Путь к свободе оказался длинным,
Мы должны его преодолеть.
Мы идем, будто по полю минному.
Лозунг наш: «Свобода или смерть!»

Нашим недругом была и есть Россия,
Ее цель – нас превратить в рабов.
Нас убивали, как траву косили
От Смоленска и до бугских берегов.

Мы – народ, мы это не забыли,
Независимость – конечный наш итог.
Мы страну свою всегда любили,
Это знает всемогущий Бог.

Сколько пережили мы страданий!
Сколько пережили мы потерь!
Не услышит враг наших рыданий.
Главный день настал для нас теперь.

Придет время всем вооружаться,
Мы сплотим свои ряды тесней.
До последнего мы все будем сражаться,
Чтоб порадоваться будущей весне.

Мы в борьбе добудем себе волю,
Так было в истории не раз.
Мы засеем житом наше поле.
Не поставить на колени нас!

Мы оставим в прошлом наши муки,
Мы продлим истории отсчет.
Мы добудем счастье нашим внукам,
Мы вернем стране нашей почет.

*15.07.2006*

# Мы к рабству привыкли

Бездарно тратим свое время,
Наказ забыли от отцов.
Мы в водочном угаре дремлем
И превращаемся в глупцов.

Смирились мы с тяжелой долей,
Терпим и источаем зло,
Совсем не боремся за волю,
Ропщем, что нам не повезло.

Мы свыклись, мы привыкли к рабству,
Неизлечимых много ран.
Как Богу, кланяются хамству
И юноша, и ветеран.

Мы робеем, не умеем,
Чтобы отпор дать. Просто срам!
Мы не горим, даже не тлеем,
Дорогу позабыли  в храм.

Молчим и время упускаем,
Хоть ноют раны от цепей.
Народ – Иуда?
Народ – Каин?
Народ – услужливый плебей?

Пора бы стать нам посмелее!
Хватит бесправие терпеть!
Давайте детям с колыбели
Лишь о свободе песни петь.

*27.08.2006*

# Добудем

Не виден впереди просвет,
 Года проходят мимо.
«Как жизнь?» – спросил меня сосед.
Ответил я:
«Терпимо».

Расходов много,
Денег нет,
Жизнь дорожает.
«Как пенсия?» – спросил сосед.
Ответил я:
«Хватает».

Бесправие,
Свободы нет,
Как будто мы не люди.
«С правами как?» – спросил сосед.
Ответил я:
«Добудем».

Россия уже много лет
Нас призывает сдаться.
«Что делать нам? – спросил сосед.
Ответил я:
«Сражаться».

*01.05.2004*

## Не тикают в избах часы

По земле радиация стелется,
Притаилась за каждым кустом.
Она кружит повсюду метелицей,
Ее жертвы лежат под крестом.

В окнах темень, огни все потушены,
А калитка слетела с петель…
Без хозяина крыша обрушилась,
И не убрана в доме постель…

Травой заросли все дорожки,
Зацвели будто в сказке сады.
Люди будто бы от бомбежки,
Убежали от страшной беды.

На дорогах смертельные знаки,
Не услышишь здесь звона косы.
Одичали здесь кошки, собаки,
И не тикают в избах часы.

Но чиновники снова трезвонят,
Позабыв о недавней беде,
И в смертельно опасную зону
Опять заселяют людей.

Мы вновь обещаниям верим.
Нас гонят на эшафот.
Пора подсчитать все потери,
Пора превращаться в народ!

Предъявим виновникам иски –
Они от суда не уйдут.
Воздвигнем потом обелиски,
Чтоб помнили люди беду.

*2004*

## Движение назад

Вперед Европа унеслась,
Литва промчалась мимо…
Наша диктаторская власть
С Востоком породнилась.

Подняла Польша паруса,
Летит с попутным ветром.
И только мы одни назад
Считаем километры.

Смешалась с цезием роса,
Стоим перед закатом.
Слышны с России голоса,
Опять зовут нас «братом».

В империю зовут сейчас,
Чтоб общей быть страною.
Будто дерьмо качает нас
У берега волною.

Нас перестали уважать,
Для всех мы – не родные,
Лишили права выезжать,
Мы все – не выездные.

Боимся высунуть мы нос,
Кабы чего не вышло.
Нам задают уже вопрос:
Может народ мы – пришлый?

*2004*

## Для оправдания нет слов

Стоял дворец, древние своды,
Виднелось кладбище вдали.
Князья, вельможи, воеводы
Покой там вечный обрели.

Там очень древние могилы,
Их возраст – несколько веков.
Не тронули их вражьи силы,
Но пришла власть большевиков…

Беда у каждого порога.
Они крушили все кругом:
Крушили храмы, веру в Бога,
И стало кладбище врагом.

Стояли плиты из гранита,
Противясь ветру и дождю.
Сейчас на тех надгробных плитах
Поставлен памятник вождю.

С тех плит сложили постаменты
(Для оправдания нет слов),
Установили монументы,
На них Калинин и Свердлов,

На них Дзержинский, на них Ленин –
Вождей кровавых целый ряд.
Поставили нас на колени,
Дорогу вымостили в ад.

Наступит время покаяний,
Над палачами будет суд.
Главным судьёй мы будем сами,
Осудим нелюдей, иуд.

*1998*

# Украли надежду

Эту ночь вспоминаю я с болью.
Были годы военные те.
Шли бандиты по снежному полю,
В дом ворвались в ночной темноте.

Дверь открылась. На улице вьюга.
Мой отец, будто снег, побелел.
Закричал я тогда от испуга
(А потом очень долго болел).

Партизан произнес в мою сторону:
«Заткните гаденышу рот!!!»
Бандиты, грабители, вороны
В страхе держали народ.

Мама ко мне подбежала,
Дала выпить глоточек воды,
Потом рот мне ладонью зажала,
Чтобы я не накликал беды.

Партизаны забрали одежду,
Все продукты с собой унесли.
Партизаны украли надежду:
Как дожить нам теперь до весны?

*2004*

# Пылала хата

Рядом шумел сосновый лес.
На фоне красного заката
Вставало пламя до небес –
Это пылала наша хата.

Ее фашисты подожгли –
Их натравили партизаны.
На догоравшие угли
Мы возвратились утром рано.

И так жили мы на углях,
Ночью и днем жили в тревоге.
Созрело жито на полях,
Но серп его уже не трогал.

Везде нас поджидала смерть,
Со всех сторон нас обложили.
Могли мы трижды умереть,
Но до победы мы дожили.

Мы выжили назло Кремлю.
Деревня наша стала нищей.
Мы возродим свою землю,
Построим дом на пепелище.

*2004*

# Омут

Я видел, как вихрился омут,
Над ним каскад ракит свисал.
Где-то там, в глубинах стонут
Все те, кого он засосал.

Унес к себе он малодушных,
Кто трудностей не перенес,
Не разум – сердце только слушал,
По жизни шел как на допрос.

Унес он тех, кто неудачник,
Кто свое место не нашел,
Жил на земле он словно дачник,
В конце концов, на дно ушел.

Унес он тех, кто просто слабый,
Не рассчитал кто своих сил,
Внимание чуть-чуть ослабил
И тоже в омут угодил.

Совет: Не надо поддаваться,
Выход всегда можно найти.
За место в жизни надо драться,
Успеешь из нее уйти.

Выжить бывает очень трудно,
Гораздо проще умереть.
Будь чаще там, где многолюдно,
Тогда забудешь ты про смерть.

*1998*



# Міхась Мазурэнка

Нарадзіўся ў 1940 годзе ў маленькай вёсачцы Старая Шаркаўшчына пад Бабруйскам. Там скончыў сярэднюю школу, потым аўтатэхнікум у Бабруйску. Пасля вайсковай службы навучаўся ў Мінскім радыётэхнічным інстытуце, быў размеркаваны ў Канструктар-

скае бюро дакладнага электроннага машынабудавання (г. Мінск), дзе працаваў 47 год. Цяпер – на пенсіі. Сваіх унукаў вучыць паважаць бацькаўшчыну і даражыць беларускай мовай. Вершы пачаў пісаць адносна нядаўна, спачатку – на рускай мове, але з цягам часу аддаў перавагу роднай беларускай мове. Гумарыстычныя вершы і байкі М. Мазурэнкі друкаваліся ў часопісе «Вожык», а патрыятычныя і лірычныя пабачылі свет у пяці супольных зборніках літаратурнага аб’яднання «Натхненне».

# Афганская Хатынь

Паўзла вужом між гор калона,
Каменне ў попел церла сталь,
А сонца смажыла шалёна,
Бы ў пекле рыхтавала баль.

Плылі сталёвыя карыты
У моры пылу, бы ў вадзе.
І камандзір сядзеў сярдзіты,
Бо ведаў пэўна – быць бядзе.

А хлапчукі, як вераб'яты,
Хапалі ротам сонца жар.
Якія з іх былі салдаты?
О Божа, Божа-уладар!

Чаго шукаць было бязвусым
На камяністых тых палях?
Нашто было нам, беларусам,
Ісці з вайной пад чужы дах?

Іх вусны смажыў жар пякельны,
З ілба іх цёк гарачы пот,
А на брані, бы на патэльні,
Ажно сквірчэў салдацкі бот.

У пекле гэтым стрэліў скат,
І стрэл рвануў так перапонку,
Што з перапуду даў салдат
Чаргу ў самлелую «зялёнку».

Ў адказ ці рэха, ці душманы –
Ніхто тады не разбіраў…
З зямлёю быў кішлак зраўняны,
Што сотні год тут прастаяў.

Не выбіраў хвалёны «град» –
Былі там «духі» ці жанчыны,
А потым «зачышчаў» атрад
І бачыў – выжыў дзед адзіны.

Унука ён на рукі ўзяў, –
Сляпы ад гора дзед не ведаў,
Што ўнук яго ужо сканаў,
Ўсяго сустрэўшы восем летаў.

Жывым ён помнікам Хатыні
Стаяў на родных камянях,
Глядзеў вачыма ўжо пустымі,
Бо іх пакінуў нават жах.

Зноў на руках ён свету нёс
Пакуты даўняга народа, –
Ў агні вайны народны лёс
Ніколі не знаходзіць броду.

Адплач, адгаласі, Хатынь,
За ўсе Хатыні у Афгане,
Хлусню уладную адрынь,
Яна цябе хай не падмане.

Бо ў Беларусі зноў ў пашане
Славянскія інтэрнацысты.
Яны ж вучыліся ў Афгане –
Палкоўнікі ДэБісты.

Там медалі сабе чаплялі,
Ляпілі зоркі на пагоны,
Лампас шырокі ушывалі,
Ды грошай кралі аж мільёны.

А ці ж не сорам, ветэраны,
Што побач месяцца яны,
І з вашымі раўняюць раны
Афганскай бруднае вайны?

Цяпер сядзяць яны высока,
Пагнаць гатовыя ізноў
Хлапцоў вясковых так далёка,
Каб не вярнуліся дамоў.

*1996*

# Тут Курапаты

Народ Беларусі сягоння ізноў
Ва ўрочышчы гэтым распяты.
Тут гора людское, пакуты і кроў,
Тут Курапаты! Тут Курапаты!

Тут колькі забітых, за што і калі,
Ніхто не ўзгадае той даты,
Іх душы блукаюць па гэтай зямлі.
Тут Курапаты! Тут Курапаты!

Усталі з крыжамі яны наўздарож,
Апошні прытулак, іх вечныя хаты
Сёння руйнуе бульдозера нож…
Тут Курапаты! Тут Курапаты!

Чаму ж ім спакойна спаць не дае
Вораг Айчыны зацяты?
Твой Гонар бароняць нашчадкі твае,
Тут, Курапаты, тут, Курапаты!

Непавага да мёртвых – то абраза жывых,
І навекі хай будзе пракляты
Не шануе й не цэніць хто продкаў сваіх.
Тут Курапаты! Тут Курапаты!

Мы будзем прыходзіць усёй грамадой
З кветкамі ў будні сюды і ў святы,
Каб ведалі людзі Радзімы маёй –
Тут Курапаты, тут Курапаты.

Інеем дрэвы ўпрыгожыў мароз,
Месячык сыпле зоркі-зярняты…
Колькі было тут і будзе шчэ слёз –
Тут Курапаты. Тут Курапаты!

*1998*



## Надзея Сармант

Нарадзілася 20.09.1941 г. у в. Ляхаўцы Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл. Скончыла Слуцкае медыцынскае вучылішча (1964), Магілёўскае педагагічнае вучылішча (1977), Мінскі педагагічны інстытут імя А. М. Горкага з адзнакай (1985). Працоўны шлях: пасля заканчэння сямігодкі – калгасніца калгаса «Новый путь» у Маларыцкім раёне (1958–1962),

адначасова вучылася ў вячэрняй школе сельскай моладзі, потым здала экстэрнам экзамены за сярэднюю школу ў школе рабочай моладзі г. п. Маларыта; медыцынскі работнік (1964–1972), загадчыца я/сада саўгаса «Савецкі» у Мінскім раёне (1973–1977); выхавальнік, метадыст я/сада №110 (1977–1984), загадчыца беларускамоўнага я/сада №456 (1984–1997) у Мінску; пасля выхаду на пенсію працавала выхавальнікам я/с №511 г. Мінска і я/с №39 Мінскага р-на (1998–2002). Сябар ГА «Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны» з першых дзён яго арганізацыі, намеснік старшыні Рады ТБМ г. Мінска (5 гадоў). Уваходзіла ў склад Камісіі Вярхоўнага Савета БССР па выпрацоўцы Закона «Аб мовах у Беларускай ССР». Аўтар метадычных распрацовак, сцэнарыяў, канспектаў заняткаў для дашкольных устаноў па азнаямленню дзяцей з беларускімі народнымі традыцыямі, народнай творчасцю, творамі беларускіх мастакоў, паэтаў, пісьменнікаў. Друкавалася ў часопісе «Пралеска», «Скрыжалях «Спадчыны», дасылала артыкулы ў газеты.

*Да творчай гільдыі паэтаў*
*Не смею я адносіцца,*
*Але як смутак душу сціснe,*
*Ці ў сэрцы раптам радасць бліснe –*
*Словы ў рыфмы просяцца.*

# Мова мая...

О, родная мова, праўдзівая, дабратворная,
Смелая, спеўная і непакорная,
Жывая, агністая, непераможная!
Мы сэрцаў сваіх часцінкаю
кожнаю
Клянёмся!
Як прадзеды нашы, цябе шанаваці,
Любіць і ахоўваць, як родную маці!
Клянёмся!
Не здрадзім табе і пад страхам-прымусам!
Мы – годныя людзі! Мы –
Беларусы!
Клянёмся!

# Да суайчыннікаў

Дарагая Айчына мая,
Ты знаходзішся на раздарожжы.
Заблудзілася доля твая –
Цісне грудзі табе бот варожы.

Курганы… Курганы…
– Курганы,
Вы якое багацце схавалі?
– Там ахвяры бясконцай вайны,
Што за волю жыццё аддавалі.

Бо спрадвеку і Захад, і Ўсход
Беларускай зямлёй таргавалі,
Вынішчалі ліцвінскі народ,
Яго душу бязбожна тапталі.

Трэба памятаць кожнаму з нас –
Шлях да праўды заўсёды адзіны:
Мала верыць, што зменіцца час –
Трэба быць патрыётам Радзімы.

# Умом Россию не понять...

*«Умом Россию не понять…»*
Но можно ли России верить?
Вот эту догму, так сказать,
История смогла проверить.

Быў час цароў, правадыроў, генсекаў:
Улада кожны раз свой твар мяняла.
Ды сутнасць тая ж заставалася спрадвеку:
«Свабода» у двукоссі Беларусь чакала.

І мову нашу, матчыну, святую
«Великий русский» цісне ўсё гвалтоўней.
Я ж не жадаю душу мець чужую,
Ні «быдлам» быць, ні проста «поголовьем».

Бо я хачу жыць розумам сваім,
Паветрам родным дыхаць на ўсе грудзі.
Хачу, каб ў краі родным і маім
Жылі не проста жыхары, а людзі.

Яшчэ хачу сваю Радзіму мець,
Чужыя гоні не хачу я мераць.
Я не хачу Расію разумець,
І не змагу ніколі ёй паверыць!

Россия, ты умом должна понять,
Свою стратегию перепроверить.
Пора, Россия, догму поменять,
Имперский пыл давно… пора… умерить!..

# Маці чакала...

*Прысвячаецца маці*
*Анатоля Бярозкі*

Падлессе ў белых снягах патанула.
Да сэрца матуля сыночка гарнула.
Спяваючы песню, не думала маці,
Што выпадзе доля: век сына чакаці.

Закінулі сына ў свет невядомы –
ГУЛАГ, Курапаты – пачвары, фантомы.
Ахутала край наш бязбожжа навала.
А маці чакала, а маці чакала…

Дзень кожны на захад нястомна глядзела,
А ў сэрцы надзея іскрынкаю тлела.
Каліна цвіла і зноў адцвітала,
А маці чакала, а маці чакала…

На ўзлеску вясеннім кувала зязюля,
Там сыну гадочкі лічыла матуля.
На вуснах асмяглых усмешка блукала.
І маці чакала, і маці чакала…

Праходзілі зімы, канчаліся леты…
Нямое пытанне: «Сыночак мой, дзе ты?»
І гэтак ў чаканні жыццё прабягала,
Так маці да скону сыночка чакала.

А сына чужая старонка прызнала,
Бо маці малілася, маці чакала.

# Паралелі

На Брылеўскай вуліцы ля ўзлётнага поля
Знявечана, скрыжавана расце боль-таполя.

А за ёю роўным радам стаяць яе сёстры,
На іх глянеш і адчуеш боль у сэрцы востры,

Бо іх голле – нібы рукі да неба ўзняты…
Нібы просяць паратунку да сябе, спагады.

Раны-нарасты на дрэвах –
след пілы няўмольнай,
Што рэзала на кавалкі іх жывое голле.

Чаму ж здзек такі ўчынілі над табой, таполя?
А таму, што расцеш ты ля ўзлётнага поля.

Каб ўзляталі самалёты – крылле не ламалі,
Вам гаротніцы-таполі, голле падразалі.

З болем, крыўдай і адчаем пытаюся ў неба:
– Каб адных адратаваці – другіх рэзаць трэба?

# Ты, мая маладосць...

*Прысвячаецца маім равеснікам*

Маладосць! Ты, мая маладосць!
Ты была? Ты прайшла? Ці ты ёсць?

Мы з табою гамонім ў цішы.
Ты і ў сэрцы маім, і ў душы,
У вірлівым патоку жыцця
Ты ўстаеш-паўстаеш з небыцця.

Маладосць! Ты, мая маладосць!
Ты была? Ты прайшла? Ці ты ёсць?

Ходзіш ўпотай дарогай лясной,
Па сцяжынцы бяжыш палявой,
Лічыш яркія зоры ўначы,
Ад мяне ты імкнешся ўцячы.

Маладосць! Ты, мая маладосць!
Ты была? Ты прайшла? Ці ты ёсць?

Думкай-марай лунаеш-ляціш,
І пад ногі сабе не глядзіш…
Вось святлее-іскрыць небакрай –
Я цябе даганю! Пачакай!

Ты была? Ты прайшла? Не! Ты ёсць?
Маладосць! Ты, мая маладосць!

## Дарога да шчасця

Хмаркі белыя лёгкія ўранні
З верхавінамі клёнаў шапталіся.
Думкі-мары і думкі-жаданні
Ў нашых сэрцах жылі-абуджаліся.

Дзень святлісты, ласкавы, духмяны
Вабіў нас запаветнымі сцежкамі.
Песня-казка лунала над намі.
Сустракалі нас кветкі усмешкамі.

Вечар бэзавы, мяккі, празрысты
Паспяшаў на спатканне з зямлёю.
Голас звонкі, таемны і чысты
Ў далячынь клікаў нас за сабою.

Неба сцішнае вышыта зорамі.
Да сябе кліча нас куст шыпшынавы.
Наша шчасце плыве над прасторамі
Нібы месяц blішчаста-бурштынавы.

# Не размінуліся

## *Песня*

*Музыка Б. Сармонта*

*Прысвячаецца С. А.*

Зорны вечар. Салаўі распеліся,
Распалілі ў сэрцы жар любві.
Калі б мы з табою не сустрэліся,
Было б меней шчасця на зямлі.

Кубік-рубікам жыццё складалася,
Зберагалі разам як маглі.
Калі б я цябе не дачакалася,
Было  б меней шчасця на зямлі.

Крочыў век суроваю аблогаю,
Белыя рамонкі адцвілі.
Калі б ты пайшоў не той дарогаю,
Было б меней шчасця на зямлі.

А вясной рамонкі зноў прачнуліся,
Хараство і радасць прывялі.
Любы мой, з табой не размінуліся –
Стала болей шчасця на зямлі!

# Патаемнае

З-пад зямлі крыніца
Рвецца ўбачыць сонца.
І вядзе дарога
Ўдалячынь бясконца.

Штосьці вецер шэпча
Па сакрэту хмарам.
Дуб, галлё ўзняўшы,
Аддаецца марам.

У бяздонне часу
Падаюць імкненні...
І жыццё саё мы...
Дзелім на імгненні...

# Думкі-карацелькі

***

Бывае, што душа галосіць
Нема, з надрывам і болем.
Што адчувае і што яна просіць?
Праўды! Спагады! І волі!

***

Не крыўдуйце, браткі-беларусы,
Пра сучасных нас шчыра скажу:
Няўжо мы – тыя доўгія вушы,
На якія зручна *вешать лапшу*?

***

Калектывізацыя, індустрыялізацыя…,
далей ідзе глабалізацыя.
Асядлалі глабалізацыю,
цяпер шукаем кансалідацыю…
Але даб'ёмся кансалідацыі,
калі не стане каланізацыі…

Каб гэта ўсё – ў каналізацыю –
мо выратавалі б цывілізацыю.

Толькі такое – утопія.

***

Пракрамлёўская Расія,
Якая ж ты Святая Русь?!
На шматкі рвеш  Украіну
І цэлішся – на Беларусь…

***

Каб сябе ўвекавечыць
І законы прысабечыць,
Яны ў народа не пытаюцца,
А яго імем прыкрываюцца.

***

Вердыкт бабы Мані

аб датэрміновым галасаванні:

– Каго выберуць –

у іх адказ ужо гатовы,

а так трактар хоць дадуць,

каб прывезці дровы.



# Ганна Хваль

Нарадзілася ў 1936 годзе ў вёсцы Скорычы Мірскага раёна Баранавіцкай вобласці (цяпер Карэліцкі раён Гродзенскай вобласці). Пасля заканчэння сярэдняй школы два гады працавала ў калгасе па месцы жыхарства. Далей – горад Мінск, вучоба ў інстытуце народнай гаспадаркі, які закончыла ў 1959 годзе. Працавала па спецыяльнасці бухгалтар-эканаміст ў гарадах Гродна, Ліда, Мінск.

# Беларусь, ты – Радзіма

Беларусь, на памежжы заўсёды скразняк.
Не маглі абыйсці цябе войны ніяк.
Не адна з іх зямлю пакрапіла крывёю,
Пабудовы твае зруйнавала з зямлёю.

Беларусь, на памежжы заўсёды скразняк.
На табе самы большы чарнобыльскі знак,
Папярэджання знак, знак пагрозы
Праз твае, Беларусь, боль і слёзы,
Праз твае непамерныя страты,
Праз твае апусцелыя хаты.
Папярэджання знак легкадумнаму свету –
Беражыце планету!

Вецер дуў, нёс бяду.
На памежжы – скразняк.
Стыў на вуснах тваіх
Палыну горкі смак.
Бо Чарнобыля чорная сіла
Так нябачнай касою касіла!
І косіць дагэтуль, і косіць.
Зарасце хай ахвярная тая магіла,
І ўжо болей ахвяраў
Ніколі не просіць.

Беларусь, тут касіла яшчэ генацыду аблава,
Па этапу вязла, забівала бязвінных.
Тут – стагоддзяў скразняк:
То князёў нашых слынных дзяржава,
То дзяржава тут вязняў,
Таксама слынных.

Беларусь, ты – чужына мая, ты – чужына.
Да сваіх не заўсёды ласкавая штосьці.
Калі ўсе на зямлю мы прыходзім як госці,
Дык  чаму ж неаднолькава ўсім нам гасцінна?

Беларусь, пагарджалі табой, гандлявалі,
Прыніжалі цябе, прыгняталі.
Нават мова была забаронена.
Рабавалі, крышылі,  ламалі,
Табой жыта пасеяна ўсе спажывалі.
А ты сееш, таму і не зломлена.

Беларусь, ты – слязінка мая, ты – слязінка,
Бо сыны твае, дочкі па свеце па ўсім
паразвеяны.
Па краёх чатырох разарваная бела хусцінка.
Каснікі між суседкамі спрытна і сквапна
падзелены.

Беларусь, ты – Радзіма мая, ты – Радзіма.
Тут жыцця майго ўток і аснова.
Нібы песня, твая мілагучная мова,
Песня маці, што ў сэрцы адзіна.
Беларусь… Белы снег на палях.
Беларусь… Белы цвет у садах.
Беларусь  у дзівосным вяночку з купалля.
Твая зорка зіхціць,
Аж да мора бяжыць
Хваля Нёмана, быстрая хваля.

Беларусь… Памяць продкаў-дзядоў.
Беларусь… Шанаванне бацькоў.
Беларусь… Вера лучыць усе пакаленні:
Не забі, не ўкрадзі,
А да Бога прыйдзі
І з малітваю стань на калені.

Беларусь, каб сябе не згубіць,
Беларусь, – роўнай з роўнымі быць,
Беларусь, заспявай сваю песню нанова!
І тады назаўжды
Адвядзе ад бяды
Сакавітая матчына мова.

## Масею Сяднёву*

Я прысвячаю верш апальнаму паэту,
Што здолеў пераплыць праз акіян адчаю.
Мне скажуць: «Непатрэбна яму гэта»,
А я ўсё ж прысвячаю, прысвячаю.

Паэт такі ўжо свой, з душою селяніна,
З хітрынкай мудраю і думкай смелай.
Пакіну тут радок яму, дзе зеляніна,
Другі пашлю да аблачынкі белай.

Ах, аблачынка, загадай сябрам-вятрам
Над Магілёўшчынай цябе пранесці нізка.
З атрутным попелам зямельку знойдзеш там,
Што некалі была паэтавай калыскай.

Яшчэ хмурынку аніяк не абыду:
Жыццёвы круг зямны – не бесканечнасць.
Травінкай з-пад касы ў пакосе я ўпаду.
Крылатым словам Вы ўзляціце ў вечнасць.

З той непазбежнасцю жадаю Вам
няхуткай стрэчы.
Бесперабойна стрэлкі лёсу няхай ходзяць.
Гады, не цісніце паэту так на плечы!
У дваццаць першае хай дыбае стагоддзе!

А будзе новае стагоддзе залатым,
Калі ўсю спадчыну Радзіма сабе верне.
І стане слова Вашае ў стагоддзі тым
Жытнёвым, буйным, залацістым зернем.

---

*Верш напісаны пад уражаннем знаёмства на Першым з'ездзе беларусаў свету і надрукаваны паэтам у часопісе «Полацак».

Непадуладна зерне марнай страце.
Без пустазелля чыстых сэрцаў ніва ёсць!
І Вы цяпер у беларускай хаце –
Руплівы гаспадар, а не часовы госць.

Паэт і слова – крыж і праца.
Салодкай мукаю Вам жыць наканавана.
Блакітам высі па-юнацку захапляцца
І заставацца… непапраўным хуліганам**.

Аж пырснуць зоркі мігатлівым смехам:
«Глядзіце ўніз, на гарадок Глен Коў!
Дзівак-паэт знаёмы (вось пацеха!)
У месяц кідае каменьчыкі ізноў!»

Памаладзее месяц, усміхнецца,
Адкажа нейкім непаўторным ззяннем.
І прыгажосць нябёсаў адгукнецца,
Успыхне на зямлі каханнем.

А я… шчадроты восені прымаю,
Блукаю па сцяжынцы вераснёвай,
Духмяны яблык у руцэ трымаю,
А ў сэрцы – мройны спеў Сяднёва.

---

**М. Сяднёў «Маё хуліганства».

# Ларыса і Янка

*Светлай памяці Ларысы і Янкі Геніюшаў*

Адну – для Ларысы, другую – для Янкі
З жытнёвага поля, з лясное палянкі
Збіраў ясны месяц у кошык бліскучы
Балады і песні краіны пявучай.

Пад гэтыя песні Ларысе і Янку
Запальвала неба кахання заранку.
Вянчалася пара ў царкве з абразамі.
Прычым жа тут Поўнач, край-свет з маразамі?

Шчасліва глядзелі Ларыса і Янка.
Пачуцці глыбелі, як рэчка Зальвянка.
Быў з хваляў празрыстых ды не замучоных
Крышталь сэрцаў чыстых ды не засмучоных.

У доме гасцінна Ларысы і Янкі.
Мінула для сына пара калыханкі.
Дарогай шырокай, сцяжынкаю доўгай
Хадзіць бы сям'ёю пачэсна пад Богам.

Да лагераў здзеку Ларысы і Янкі
Дваццатага веку этапаў паўстанкі.
Зубчаты часнок муж падорыць бы кветку
І з белай лілеяй убачыць паэтку.

На Поўначы ў тундры за дротам – баракі.
Пакутуюць, гінуць у іх небаракі.
Там голад і холад, і рабства, і шмоны.
Там пекла! Там зоны! Ахвяраў мільёны.

За дротам – сабакі, мароз, канваіры.
Ідзе кіркаваць камандзірам сарціры
Прыгожая зэчка – не выдасць, не схлусіць…
ГУЛАГ. Пратрымайся, дачка Беларусі.

Прыгожая зэчка, ты ў чым вінавата,
Паэтка, а кірка ў руках ды лапата?
«У чым вінавата? Малюся зацята,
Каб вольнай была беларуская хата.

Знявага. Знямога. Ды выжыць павінна.
Я – маці. Мяне адарвалі ад сына.
Мне вечар тут змрочны, мне дзень тут халодны.
А дзе ж мой сыночак? А з кім жа ён, родны?

Ніжэй да зямлі прымушаюць згінацца.
Ніжэй, каб забыць, хто ты ёсць, каб зламацца.
На белай анучы мой нумар, мой чорны –
Цяжар дадатковы, ды лёс непакорны.

Цыдулкі лятуць землякам, як глюкоза,
Як лекі ад роспачы і ад марозу.
О, не! Не забуду, хто я! Спадзяюся,
Бог дасць, прытулю свайго сына. Вярнуся.»

Вітайма, віншуйма Ларысу і Янку!
А ў Зэльве няўтульна – хістаюць буслянку,
Дзе годнасці святасць, дзе шчырасці светласць,
Ды болем у сэрцах сустрэчы няветласць.

Суцішыўся боль ваш, Ларыса і Янка…
Жыццё – як імгненне, жыццё – як маланка.
Паклон вам за мужнасць, за вершаў гаючасць.
Навекі і памяць, і душ неўміручасць.

## Пра ружу чырвоную

*Памяці Уладзіміра Мулявіна*

Заўчасна пакінуў гітару ўладар,
Пявучую, ды засмучоную.
А песні жывуць – найкаштоўнейшы дар,
Адна з іх – пра ружу чырвоную.

*«Чырвоная ружа,*
*Не стой на дарозе,*
*Не стой на шырокай –*
*Хто йдзе, той ламае».*

Мы ўсе на дарозе, мы на скразняку
З пары, калі шлях пачынаецца,
І хто басанож, і хто ў мяккім вазку –
Дарога ва ўсіх скарачаецца.

*«Не стой на дарозе,*
*Чырвоная ружа,*
*Хто йдзе, той ламае,*
*Хто йдзе, той шчыпае».*

Дарогі ўсяго – ад зямлі да нябёс.
Хоць клетку здабудзь залачоную,
Ламае, шчыпае нас кожнага лёс
Няўмольна, як ружу чырвоную.

*« – За што, за што*
*Якое дзіва?*
*– За тое, за тое,*
*Як ты красіва».*

Паўторыцца ў небе начным зарапад…
Была ў песняра доля зорная.
Застаўся расквечаны песнямі сад,
Не звяне ў ім ружа чырвоная.

«*Чырвоная ружа,*
*Чырвона ружа,*
*Чырвоная ружа,*
*Чырвона ружа*».

# Да Беларусі

Як падуў з Усходу вецер,
Як падуў з Заходу вецер,
Ой, паразляталіся
Лебедзі ды гусі.
Белы крылы – іх прымета.
Паспрыяй, Зямля-планета,
Ім вярнуцца на Радзіму –
Да Беларусі.

То з Усходу, то з Заходу
Робяць тут вятры пагоду.
А не распагодзіцца
На двары тутэйшым,
Покуль крылы маладыя
Не заслоняць, удалыя,
Край ад непагадзі штучнай,
Край наймілейшы.

Покуль крылы маладыя,
Падуладна ўся стыхія.
Дык хутчэй вяртайцеся,
Нават калі хмарна.
Белы крылы, белы крылы,
Узмахніце, што ёсць сілы,
І старанні-намаганні
Не загінуць марна.

Як падуў з Усходу вецер,
Як падуў з Заходу вецер,
Ой, паразляталіся
Лебедзі ды гусі.
А край родны іх чакае,
І край родны ім гукае:
«Гыля-гыля, гыля-гыля
Да Беларусі!»

# Восеньскі келіх

Надзела восень завушніцы-павуцінкі,
А фартушок у гаспадыні верасовы,
Расфарбавала ўсім бярозкам іх хусцінкі,
І мне таксама прапаноўвае абновы.

Ой, не ўплятай жанчыне ў косы ніткі срэбра,
Пакуль на вуснах мёд ліпнёвых пацалункаў!
Не трэба, восень, моцна хмурыцца, не трэба,
Недарагіх чакала першых падарункаў.

З настоеных кропляў дажджу на самоце
Настойліва-чынна пітво падаецца.
Ах, восеньскі келіх ды на пазалоце,
Кахання касцёр не тушы ў маім сэрцы!

Святло і сум. Шчымлівасць
быццам без прычыны.
Беспамылковасць бачу восеньскіх рахункаў:
Гаркавасць ягадаў кастрычніцкай рабіны
Разбавіць мёд маіх ліпнёвых пацалункаў.

Дыван з лістоты пад нагамі не стракаты.
Крану карону з ніткаў срэбра – выгляд горды.
Іду далей, дзе дождж выстуквае ўсе страты,
Палоняць восені мінорныя акорды.

З настоеных кропляў дажджу на самоце
Настойліва-чынна пітво падаецца.
Ах, восеньскі келіх ды на пазалоце,
Кахання касцёр не тушы ў маім сэрцы!

# Жанчынам

Вы стаміліся крыху, а можа да поту,
І ад дзённых турботаў пагляд ваш прыгас.
Адкладзіце, жанчыны, турботы на потым.
Гэтым роздумам шчырым вітаю ўсіх вас.

Калі вы сумавалі, чым сум ваш развеяць,
Каб ад вашых усмешак квітнела зямля?
Хай ніколі нідзе вас не міне надзея.
Хай надзейнай апорай вам будзе сям'я.

Лёс паслаў адзіноту… Што плакаць бясконца?
Не маркоціцца ж вечна, забіўшыся ў кут.
Ужо тое адно, што вы бачыце сонца,
Дае права лічыць, што жыццё – гэта цуд!

Дзе шануюць Матулю, Радзіму, Прыроду,
Там адыдзе бяда, там зацішыцца боль.
Запаветныя словы жаночага роду,
Нашым жылам вы кроў, нам і хлеб вы і соль.

Апячэ асалодай жар вуснаў употай…
І таго, хто вартуе ўсе вашыя сны,
Адарыце цяплом, абудзіце пяшчотай.
З вамі і ў халады чуцен подых вясны.

Ззяюць зоркі ў вачох, не патушыць іх вечар.
Прыгажосці такой – свет аб'едзь – не спаткаць.
Сёння хораша мне, ды кароткая стрэча.
З вамі новае стрэчы дазвольце чакаць.

# Усё змянілася

Бярозка! Ён кахаў, мяне кахаў.
Пра тое ўжо табе хвалілася.
Але ж прыезджую спаткаў.
Яе спаткаў.
І ўсё змянілася.

Усё змянілася, павер.
Усё навокала!
Паўлінам ходзіць ён цяпер,
А быў жа сокалам.

Бярозка! Ён туліў, мяне туліў.
А сэрца так салодка білася.
Яскрава месяц засвяціў. Тады свяціў,
Ды ўсё змянілася.

Прынесла хмара цемру зла
Мне з той разлучніцай.
Вярні, бярозка, міг святла
І стань заступніцай.

Бярозка! Ён чакаў, мяне чакаў
Заўсёды тут, заўсёды звечара.
Сваёю суджанай назваў. Калі назваў,
Я не пярэчыла.

Відаць, хлусіць ён быў мастак.
Усё змянілася!
Я пакахала, гэта так,
Ды… памылілася.

Бярозка! Не кахаў, ён не кахаў.
Любоў яго – любая стрэчная.
На развітанне паўтараў, ды паўтараў:
«Бывай, сардэчная».

Сумуе зорка, што ўзышла
Над Белай Вежаю.
Я да цябе адна прыйшла,
Бо ён – з прыезджаю.

# Восені сумнай матывы

Восені сумнай матывы і фарбы
Сэрцу прыйшліся майму да спадобы.
У пазалоце стаяць дрэвы-скарбы,
Трывожна ад гэтай аздобы.

Сум, не хачу заставацца сам-насам.
Выратавальнае бачыцца выйсце:
Стану я ў кола, дзе восеньскім вальсам
Адкрые баль жоўтае лісце.

Восень жыцця. Толькі астры ў букеце.
Толькі пякучка-сляза, як прызнанне.
Журыцца ў небе жураўлік па леце,
Высокае шле віншаванне.

Восень жыцця не ўспрымаю як драму.
Восенню восень – удзячная дата.
Ціхенька дождж аб ваконную раму
Пастукаў: «Са святам, са святам.»

Восені сумнай матывы і фарбы
Вобразам родным з мінулага глянуць.
Ды неўзабаве і самі без скаргі
Мінулым і памятным стануць.

## Спявала гітара

Спявала гітара… Да сэрцаў адкрытых
Восеньскі вечар мелодыю нёс.
І летуценні праз песню забытую
Уваскрашалі пражыты мой лёс.

Спявала гітара… Чароўныя гукі
Мне падарылі спатканне з табой.
Ці то мелодыя, ці сэрца стукае:
Я – маладая, і пахне вясной!

Спявала гітара… З вядра залатога
Месяц купаў у святле сонны сад.
Тыя гады майго шчасця нядоўгага
Песня гітары вярнула назад.

Спявай жа, гітара! Дазволь мне застацца
Госцяй у садзе мінулай вясны,
Вуснам дай з квецені белай акацыі
Слодыч тых кропляў світальнай расы.

Заціхла гітара, нібы не спявала…
Змоўклі акорды, спынілі свой бег…
Яблыкі падалі ў травы павялыя.
Клікала восень ізноў да сябе.

# Свята

Новы год, новы век новае эры.
У нараджэнні Хрыста – веліч веры.
Пад зоркай яснай
Сын Божы ў яслях –
свята.
Сына і Маці
Рады ўслаўляці –
свята.

Свята святое,
Свята.
Свята святое,
Свята.

Ад панядзелка ажно да суботы –
Праца ды звыклыя ў хаце турботы.
А ўжо ў нядзелю
Не да кудзелі –
свята.
Шэсць дзён працуем,
Сёмы святкуем –
свята.

Свята між будняў,
Свята.
Свята між будняў,
Свята.

Праз уваскрэсенне на ўратаванне
Збаўца Хрыстос людзям даў спадзяванне.
Мы на Вялікдзень
Да храмаў прыйдзем –
свята.
Сонейка грае,
Цемра знікае –
свята.

Свята ўсіх святаў,
Свята.
Свята ўсіх святаў,
Свята.

Месяц за месяцам, дзень за дзянёчкам,
Колас да коласа – сноп за снапочкам.
Вось і дажынкі,
З поля сцяжынкі –
свята.
Як жывем-дбаем,
Дык з караваем –
свята.

Свята дажынкаў,
Свята.
Свята дажынкаў,
Свята.

Песня ліецца,
І ў чулых сэрцах –
свята.

Загояць рану
Гукі баяна –
свята.
Будзе не лішнім
Танец увішны –
свята.
Гармонік цешыць
Зяця і цешчу –
свята.
Цымбалаў звоны,
Гасцям паклоны –
свята.
Шчасця вам, госці,
І весялосці –
свята.
Песню прыміце,
Сэрцы будзіце –
свята.

Свята сардэчна,
Свята.
Свята сардэчна,
Свята.

# Змест

Прадмова ........ 3

Святлана Багданкевіч ........ 5
Экспромт да Дня волі 2015 ........ 7
Код несмяротнасці ........ 8
Белы сцяг ........ 10
Непераможнасць ........ 11
Каб не ўмёрлі ........ 12
Беларусы ў горадзе ........ 13
Імперац ........ 14
Дзень з вершамі Ірыны Багдановіч ........ 15
Чуйную ........ 17
Без мяне ........ 18
****Ноч. Ты спіш* ........ 19
Ёсць пытанне ........ 20
Здарэнне на ТБ ........ 21

Мікола Бакас ........ 23
Малітва беларуская ........ 25
Да Божае ласкі – пад сьцягам Хрыста ........ 26
Вясна будзе ........ 27
Пан Хрыстос уваскрос! ........ 28
Гаворка пра Паўночную Карэю ........ 30
Не верце рабам ........ 34
Мы – ліцьвіны ........ 36
Маналог Айца Леаніда (Акаловіча) ........ 37
****Ты вольны, калі над усім гаспадар…* ........ 39
З Пагоняй і вераю – да перамог ........ 40

Вера Буланда ........ 41
Крый Божа ........ 43
****Хто там плявузгаў…* ........ 44
****Чым болей мы жывём…* ........ 45
Асцярожна ........ 46
****Ад хмаркі птушка адплыла за небасхіл…* ........ 46
****Раскрыжаваная і вінаватая…* ........ 47
****Ах, словы, словы, самыя патрэбныя…* ........ 47

***Да ніткі абабраная душэўнасць…* .................. 48
На чужым свяце ........................................ 49
Буланды ............................................... 50
Я вярнуся ............................................. 51
Перыпетыя ............................................. 52
Упэўненасць ........................................... 52
Адкуль? ............................................... 52
Сапраўды .............................................. 53
Рубаі ................................................. 53
У прыцемках ........................................... 54
***Выпеставаны сонейкам рамонкі…* ................ 55
Самотны лебедзь ....................................... 56
***Прыехаць бы на Мсціж свой леташні…* ....... 57
Не астудзі ............................................ 58
На Гоцкім беразе ...................................... 59
Танка ................................................. 60
***Мы часта любім тых, хто нас не варты…* ..... 60
Не аддай другому ...................................... 61
Асот і крапіва ........................................ 62
***Я размаўляю з нематой…* ........................ 63
***Згарае восень у рабінавым пажары…* ........... 64

Аляксандра Грыцкевіч .................................. 65
Memento ............................................... 67
Праўда пра боль ....................................... 69
***Не шукай у бальніцы здароўя* ...................... 70
***Посвісты ветру ў разбураных вежах* .............. 71
***Маімі суразмоўцамі былі…* ....................... 73
Нататкі дылетанта ..................................... 74
Свойская бяседа ....................................... 77
Мініяцюры ............................................. 78

Пераклады ............................................. 79
Рыгор Шырман. «На глінянай зямлі…» ........... 79
Уільям Шэкспір. Санет 66 ............................. 80
Мікалай Забалоцкі. «Не дазваляй душы…» ..... 81
Сяргей Ясенін. «У жыцці усё мана…» ............... 82
Ганна Ахматава. «Адны у ласкавыя
глядзяцца вочы…» ................. 83

Яўген Гучок ............ 85
Слова да чытача ............ 87
Пакутнік-пілігрым ............ 90

Ілля Копыл ............ 105
На перекрестке ............ 107
Мне 80 лет ............ 111
Очнитесь, беларусы ............ 114
След москаля ............ 115
Судьба ............ 117
Путь к свободе ............ 119
Мы к рабству привыкли ............ 120
Добудем ............ 121
Не тикают в избах часы ............ 122
Движение назад ............ 123
Для оправдания нет слов ............ 124
Украли надежду ............ 125
Пылала хата ............ 126
Омут ............ 127

Міхась Мазурэнка ............ 129
Афганская Хатынь ............ 131
Тут Курапаты ............ 134

Надзея Сармант ............ 135
Мова мая ............ 137
Да суайчыннікаў ............ 138
Умом Россию не понять… ............ 139
Маці чакала… ............ 140
Паралелі ............ 141
Ты, мая маладосць… ............ 142
Дарога да шчасця ............ 143
Не размінуліся ............ 144
Патаемнае ............ 145
Думкі-карацелькі ............ 146

Ганна Хваль ............ 149
Беларусь, ты – Радзіма ............ 150
Масею Сяднёву ............ 153
Ларыса і Янка ............ 155

Пра ружу чырвоную ........................................ 157
Да Беларусі ................................................... 159
Восеньскі келіх ............................................ 160
Жанчынам .................................................... 161
Усё змянілася ............................................... 162
Восені сумнай матывы ................................... 164
Спявала гітара .............................................. 165
Свята ............................................................ 166

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Аднойчы вечарам**
Вершы тэбээмаўскіх паэтаў

Аўтар праекта *Я. Гучок*
Укладальнік *М. Бамбіза*
Рэдактары *М. Бамбіза, Н. Сармант*
Кампутарны набор *Н. Сармант*
Адказны за выпуск *Зм. Колас*

Падпісана да друку 18.11.2015. Фармат 84×90 $^{1}/_{32}$.
Папера офісная. Друк лічбавы.
Ул.-выд. арк. 5,45. Ум. друк. арк. 7,53.
Наклад 150 асобнікаў. Заказ б/н.

Выдавец і паліграфічнае выкананне
індывідуальны прадпрымальнік Зміцер Колас.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка
друкаваных выданняў № 1/291 ад 17.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 105-14, 220023, Мінск.